Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня
штодзённая газэта

СУБОТА
19 сакавіка 1932 г.
№ 63 (3452)

Сеньня у нумары:

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВЫ. Няўхільна ажыцьцяўляем ленінскую нацпалітыку. С. А. Арганізацыя і зьмест работы ў школьных майстэрнях і на вытворчасьці (2 стар.). В. ВОЛЬСКІ, М. МОДЭЛЬ. «Штурм» (Яўр. Дзярж. тэатр БССР) (2 стар.).
Выступленьне т. ЛІТВІНАВА на канфэрэнцыі «па разбраеньні»
Пробнымі выездамі ў поле, перадавыя калгасы правяраюць падрыхтаванасьць да сяўбы.
Пры ўдзеле шырокіх працоўных мас па бальшавіцку змагацца за моцны, гнуткі савецкі апарат (2 стар.).
За суцэльную пісьменную БССР (2 стар.).
Сацыялістычнай жывёлагадоўлі—добраякаснае і таннае памяшканьне.

Няўхільна ажыцьцяўляем ленінскую нацпалітыку

Толькі ленінская партыя, толькі дыктатура пралетарыяту, толькі Савецкая Ўлада поўнасьцю і да канца з усёй рэвалюцыйнай пасьлядоўнасьцю вырашыла нацыянальнае пытаньне. Толькі ў СССР няма пануючай і прыгнечанай нацыі. Рабочыя і працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяў зьяўляюцца гаспадарамі вялікай неабсяжнай краіны саветаў. Савецкі Саюз ёсьць адзіная бацькаўшчына пралетарыяту ўсяго сьвету.

На аснове правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, усямернай дапамогі брацкіх рэспублік усяго Саюзу, адбываецца бурны рост раней прыгнечаных, падняволеных царызмам народаў. Савецкі Саюз зьяўляецца найлепшым і найскравейшым прыкладам таго, як перамогшая рабочая кляса, узяўшы ўладу ў свае рукі, зьнішчае путы няволі, замацоўвае брацкі саюз з усімі працоўнымі.

Савецкая Беларусь, неадрыўная частка СССР, верны фарпост на рубяжы двух сьветаў пад кіраўніцтвам ленінскай партыі дамаглася вялізарнейшых перамог. У цесным саюзе з усёй рабочай клясай, з усімі працоўнымі СССР, пры іх дапамозе, Савецкая Беларусь шпаркімі тэмпамі ператвараецца з краіны адсталай, аграрнай, з краіны няпісьменнай, у краіну індустрыяльна-калгасную, у краіну суцэльнай пісьменнасьці. Растуць новыя волаты—заводы і фабрыкі, раздробленая, сельская гаспадарка, цемень, галеча, пастаянны голад, адыйшлі у мінуўшчыну. Бядняцка - серадняцкія масы сялянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду камуністычнай партыі цьвёрда сталі на калгасны шлях, на шлях сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, на шлях пабудовы сацыялізму.

КП(б)Б няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку дамаглася і на гэтым фронце вялізарнейшых перамог. Партыя і рабочая кляса разьбілі контррэвалюцыйных нацыянал - дэмакратаў—гэтых агентаў польскага фашызму, партыя ачысьціла свае шэрагі ад нацыянал-апартуністаў, агентуры клясавага ворага. Непаслабляючы барацьбы з контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, партыя наносіла і наносіць руйнуючы ўдар па вялікадзяржаўных шавіністах, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, па шавіністах іншых колераў.

КП(б)Б і ўрад БССР, выходзячы з ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, пастанавілі рэарганізаваць Койданаўскі раён у нацыянальна-польскі. Гэтая пастанова мае вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне. Койданаўскі раён, дзе большасьць насельніцтва працоўных—палякі яшчэ больш шпарка разаўе тэмпы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Працоўныя палякі, як частка трудавога калектыву СССР маюць вялізарнейшыя дасягненьні на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Расьце і разьвіваецца польская культура, нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу.

Дасягненьні рабочай клясы СССР, як на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, так і на фронце культурным, асабліва яскравы, калі глянуць па той бок мяжы, дзе капіталізм нястрымна коціцца да катастрофы, а буржуазная культура разлагаецца, ідзе да ўпадку.

Сыстэма сацыялізму—сыстэма брацкага сужыцьця працоўных усіх нацыянальнасьцяў, сыстэма палепшаньня дабрабыту шырокіх мас, сыстэма канчатковай ліквідацыі эксплёатацыі чалавека чалавекам. Сыстэма капіталізму—гэта дзікая эксплёатацыя рабочай клясы і працоўных, гэта падняволень не народаў слабейшых нацыянальнасьцяў. Капіталісты, як п'яўкі высмоктываюць кроў з рабочых і прыгнечаных народаў, рабуюць іх натуральнае багацьце.

Возьмем для прыкладу фашысцкую Польшчу, якая на акупаваных землях Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны праводзіць самую драпежніцкую палітыку. Усякае праяўленьне рэвалюцыйна-нацыянальна-вызваленчага руху буржуазія прыдушае самым жорсткім чынам. Ня можа быць і гутаркі аб якім-бы та ні было дасягненьні як у гаспадарчых, так і ў культурных адносінах. Карныя экспэдыцыі, палявыя суды, шыбеніцы, паліцэйскі бізун для рабочых, для шырокіх мас працоўнага сялянства і... ўступкі для беларускай і украінскай буржуазіі.

Польская буржуазія жорстка расправляецца ня толькі з рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, а з усімі рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі без розьніцы нацыянальнасьці. З поўнай яскравасьцю выступае не адзіны нацыянальны фронт, а адзіны клясавы фронт. Буржуазія прыгнечвае, эксплёатуе рабочых без нацыянальнага разбору. Пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мабілізуе масы, на адзіны клясавы фронт супроць капіталізма, супроць эксплёататараў.

Рабаўнічую калёніяльную палітыку імпэрыялістаў Англіі, Японіі, ПАЗША, Францыі і г. д. моцна адчуваюць на сваіх сынах прыгнечаныя народы калёній і паўкалёній. Індыя, Марокка, Гаіці, Конга, Інда-Кітай, Алжыр і г. д. штодня заліваюцца крывёю рабочых і сялян.

Нацыянальную палітыку імпэрыялісты праводзяць куляметамі, газавымі бомбамі, масавымі расстрэламі і подкупам буржуазіі. Прыгнечаныя народы і нацыі бачуць і ведаюць, што толькі ў Савецкім Саюзе няма нацыі прыгнечанай, няма нацыі пануючай і таму усе вышэй і вышэй узьнімаецца сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы, пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду камуністычнай партыі за Савецкую ўладу, за дыктатуру пралетарыяту. Хістаюцца ўстоі капіталістычнага ладу, пад ударамі крызісу, трашчыць уся капіталістычная сыстэма.

Толькі краіна саветаў, адзіная краіна ў сьвеце, якая ня ведае крызісу, толькі Савецкая ўлада, самая моцная ўлада рабочых і сялян, улада, якая карыстаецца неабмежаваным даверам, любоўю мільёнаў рабочых, мільёнаў калгаснікаў і працоўных СССР і мільёнаў рабочых і прыгнечаных імпэрыялізмам.

Койданаўскі раён прыступае да перавыбораў саветаў,—органаў дыктатуры пралетарыяту, праводнікаў генэральнай лініі партыі. Койданаўскі раён, як і ўся БССР мае вялізарнейшыя дасягненьні, аднак, ранейшае койданаўскае раённае кіраўніцтва дапусьціла рад грубейшых памылак. Перавыбары саветаў павінны быць выкарыстаны для шырокай папулярызацыі дырэктыў партыі і ўраду, для шырокай папулярызацыі пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII-й канфэрэнцыі ЎсеКП(б), для канчатковага ізжыцьця дапушчаных памылак.

Перавыбары саветаў павінны быць шчыльна ўвязаны з мабілізацыяй мас на выкананьне гаспадарча-палітычных дырэктыў партыі і ўраду. Узмоцніць барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, дамагчыся ўкарэненьня зьдзельшчыны, вынішчыць калгасаў абязьлічку і ўраўнілаўку, падбаявому ў бліжэйшыя дні дамагчыся поўнай перамогі ў засыпцы насеннфондаў, па-бальшавіцку падрыхтаваць да правядзеньня веснавой сяўбы, вось асноўныя задачы.

Койданаўская партыйная арганізацыя ў рашучай барацьбе на два фронты—супроць правага ўхілу як галоўнай небясьпецы на даным этапе, супроць «лявацкіх» загібаў і прымірэнцтва да іх, пад кіраўніцтвам КП(б)Б з гонарам выканае пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Супроць акупантаў, супроць імпэрыялістаў

ШАНХАЙ. 17-III. Камісія лігі нацый атрымала з Мукдэну тэлеграму ад імя розных кітайскіх грамадзкіх і грамадзянскіх арганізацый, якія, як указваецца ў тэлеграме, прадстаўляюць «30 мільёнаў кітайскага насельніцтва Манчжурыі».

Падпісаўшыя тэлеграму выказваюць жаль, што яны ня маюць магчымасьці прыняць камісію лігі нацый у сябе на бацькаўшчыне, таму што іх бацькаўшчына разбурана і захоплена японцамі, якія адмаўляюць кітайцам нават у элемэнтарных правах на існаваньне. Японцы называюць бандытам кожнага кітайца, праяўляючага хоць каплю нацыянальнага спачуцьця і працягваюць фабрыкаваць іх (бандытаў) дзеля таго, каб апраўдаць захоп кітайскай тэрыторыі і прымусіць насельніцтва вітаць «абарону з боку японцаў». Так званая манчжурская дзяржава, гаворыцца ў тэлеграме, зьяўляецца цацкай у руках японскай ваеншчыны.

Ад імя 30-ці мільённага кітайскага насельніцтва Манчжурыі, гаворыцца далей у тэлеграме, мы заяўляем, што будучыня гэтага насельніцтва зьвязана непарыўна з лёсам Кітаю. Будучыня пакажа, гаворыцца ў тэлеграме, ці зможа ліга нацый давесьці, што ў сучасных варунках права вышэй сілы. У заключэньне выказваецца рашучая гатоўнасьць змагацца супроць перамогі сілы над правам.

Паўстане кітайскага гарнізону ў Сахаляне

БЛАГАВЕШЧАНСК. (Роста). 10 сакавіка а 7-й гадзіне раніцы ў гор. Сахаляне, размешчаным на процілеглым беразе Амура, паўстаў гарнізон кітайскага войска, абурашы узьняцьцем сьцягаў новага манчжурскага ўраду. Паўстаньне пачалося вялікай стрэльбай і кулямётнай стралянінай, прычым кулі заляталі ў Благавешчанск.

Паводле вестак, начальнік штабу ўрадавага войска Цэ-Юй узяты паўстаўшымі ў палон і трымаецца пад арыштам. Паўстаўшымі забіта каля 10 афіцэраў, таксама японцы—цырульнік і фатограф.

Адбываюцца бесспэрапынныя прабіжкі, прычым наводзе даных, разгромлена аддзяленьне савецкага Дзяржгандлю, а таксама магазын савецкага прамаслянніна. Паўстанцы разграмілі ўсе кітайскія банкі, турму, ламбарды і г. д.

Японскі консул і адзін японскі рэзыдэнт, а таксама дырэктар кітайска-га дзяржбанку разам са служэбнымі і сем'ямі перайшлі савецкую граніцу і знайшлі прытулак у Благавешчанску.

Кіраўнік ангельскай мытніцы, Кроссман, пад якім паўстаўшыя ўчынілі гвалт, а таксама жонка камісара мытніцы, таксама выратаваліся пераходам на савецкі бок.

Да вечара паўстаўшае кітайскае войска двума групамі разьмясьцілася ў паўночна-ўсходнім і заходнім бакох гораду.

Сем'і супрацоўнікаў савецкага кон сульства пераправіліцца ў Благавешчанск.

У краіне белага тэрору, палявых судоў

Усеагульная забастоўка ў фашысцкай Польшчы

Толькі ў аднэй Варшаве арышт вана 500 чал. Аблавы і арышты адбываюцца па ўсёй Польшчы. Паліцыя ў баявой гатоўнасьці

ВАРШАВА. Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор усеагульная забастоўка пратэсту супроць замаху ўраду на рэшткі сацыяльнага заканадаўства ў Польшчы абгрунтавана. У Варшаве бастуюць рабочыя большасьці дробных і сярэдніх прадпрыемстваў шкіпай, трыкатажнай і харчовай прамысловасьці. У Беластоку бастуюць рабочыя большасьці тэкстыльных фабрык і лесапільных заводаў. У Лодзінскім ваяводзтве бастуе звыш 5.000 рабочых. У Келецкім ваяводзтве бастуе каля 6.000 рабочых. У Горным Шлёнску цалкам бастуюць рабочыя буйных шахтаў і мэталюргічнага заводу «Гута Пэнюю». Бастуюць рабочыя амаль усіх прадпрыемстваў у Цешыне і ў Бельску. У Дамброўскім рабіе забастоўка ахапіла літаральна ўсе буйныя прадпрыемствы. У Дамброўскім каменна-вугальным басэйне бастуюць усе рабочыя.

Забастоўка адбываецца ва ўмовах выключнага паліцэйскага тэрору і адкрытага штрэйкбрэхерства з боку яваўшчыкаў і скрытага штрэйкбрэхерства пэпэсаўцаў.

Газэты паведамляюць, што ПЦС за гадзя арганізавалі дружыны са сваіх мясцовых арганізацый, якія па якіх-небудзь «важкіх матывах» сарвуць забастоўку. Яваўшчыкі апублікавалі адозву, у якой яны таксама заявілі адкрыта штрэйкбрэхерауную пазіцыю.

Арышты рэвалюцыйных рабочых утвараюцца ў сябачных разьмерах. У Варшаве арыштаваны ўсе, хто калі-небудзь быў замешан або западозраны ў рэвалюцыйнай дзейнасьці. Прыблізны лік арыштаваных у Варшаве складае 500—600 чалавек. У Варшаве і іншых важнейшых гарадох Польшчы паліцыя і жандармерыя прыведзены ў баявую гатоўнасьць. На вуліцах увесь час цыркулюць патрулі пешай і конай паліцыі.

Катарга, турма, катаваньні, заб ойствы

ВАРШАВА. 16-III. Лодзінскі акруговы суд прыгаварыў 6 малодых рабочых, на чале з Соф'яй Тыбура, на 5, 4, 3 і 1½ гады катаргі за ўдзел у камуністычнай дэманстрацыі.

Акруговы суд у Роўне прыгаварыў за «шпіёнаж» Барушэўскага і Устахаву на 10 год катаргі, Шапавалава—на 6 год і яшчэ двух на розныя тэрміны. Пракурор заявіў пратэст супроць «вельмі слабога прыгавору».

ВАРШАВА. 11-III. У акруговым судзе ў Варшаве на працягу 4 дзён слухалася справа 8 асоб, абвінавачваных у прыналежнасьці да кампартыі. На другі дзень працэсу, у часе перапынку адбыўся інцыдэнт, які зрабіў на публіку, што знаходзілася ў залі суда вялікае ўражаньне: прыведзеныя ў залю суда пасьля доўгага перапынку зьявілеся заявілі, што іх толькі што зьбівалі ў арыштанцкім пакоі ў памяшканьні суду ў прысутнасьці пра курора Каўчака. 6 абвінавачваных прыгавораны да розных тэрмінаў зьняволеньня ў катаржнай турме (ад 6 да 4 год), адзін—да 4 мес. турмы.

Па СССР

Першага мая тры савецкія дырыжаблі будуць лётаць над СССР

Дырыжаблябуд узяў на сябе абавязак выпусьціць 1-га мая два караблі: «1-га Мая» ёмасьцю 2.200 куб. мэтр. і «Пяцігодка ў чатыры гады», ёмасьцю ў 5.000 куб. мэтр.

Гэта першыя два дырыжаблі пабудаваныя без замежнай дапамогі, савецкімі інжынэрамі, савецкімі рабочымі, з савецкіх матар'яляў і на савецкай вытворчасьці.

Абалочкі для гэтых караблёў робяцца па чарцяжох і праектах Дырыжаблябуду на заводзе «Каучук», а гондолы ў ЦАГІ.

Паветраныя караблі будуць зьбіраецца ў Ленінградзе ў эліпу на Воўкавым полі. Да зборкі першага дырыжаблю ўжо прыступлена. Да другога дырыжаблю абалочка гатова. Гондола будзе гатова 20 сакавіка.

Карабель «1га Мая» мае па даўжыні 45 мэтр. Будзе разьвіваць хуткасьць 95 клм. у гадзіну, разьлічаны на палёт без насадкі на 7 гадзін. Адначасовы над'ём людзей—7 чал.

Карабель «Пяцігодка ў чатыры гады» даўжынёю 68 мэтр, хуткасьць палёту 110 клм у гадзіну, «грузаёмкасьць 18 чал. Карабель без насадкі можа прайсьці 1.200 клм.

У 14-ю гадавіну Чырвонай арміі рабочымі-ударнікамі заводу «Каучук», Дырыжаблябуду і ЦАГІ высунуты сустрэчны плян—выпусьціць да 1мая замест 2-х караблёў—3 караблі.

3-ці карабель выпускаецца пад імем «Ударнік заводу «Каучук», Дырыжаблябуду і ЦАГІ». 3-ці паветраны карабель абхватам у 6.500 куб. мэрт. Карабель апроч падрыхтоўкі калраў будзе скарыстаны на вопытнай эксплёатацыі.

Калі Нямеччына патраціла 9 дзесят кі год пакуль пабудавала дырыжабль тыпу «Граф Цэпэлін» дык мы пры падрыманьні савецкіх вучоных, савецкіх кваліфікаваных рабочых па нашых заводах, пры цвёрдыманьні ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, пад кіраўніцтвам партыі павінны дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны як перагналі іх па другіх галінах прамысловасьці.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ ПРАФСАЮЗАЎ

⊙ 17-га сакавіка на дзённым паседжаньні зьезд заслухаў даклад т. Гарэгляда аб рабоце рэвізійнай камісіі ЦСПСБ. Дакладчык спыніўся на фінансавым становішчы. Цэнтральнага Савету Прафэсыянальных Саюзаў і на рабоце апарату ЦСПСБ.

Бюджэт прафсаюзаў — зазначае тав. Гарэгляд,—за апошнія гады значна вырас. Калі ў 1930 годзе бюджэт раўняўся 8 мільёнам 334 тыс. руб., дык па зацверджаным УсеЦСПС каштарысу на 1932 г. бюджэт прафсаюзаў БССР складае 16 мільёнаў 852 тысячы.

Паменшыліся выдаткі на ўтрыманьне апарату з 40 проц. да 27.

Далей тав. Гарэгляд гаворыць аб радзе скажэньняў у фірабоце асобных прафсаюзных арганізацый. Ёсьць значнае перавыдаткаваньне каштарысаў і запазычанасьці па членскіх узносах.

Значным недахопам у фінансавай рабоце прафсаюзаў зьяўляецца слабая работа рэвізійных камісій.

У заключэньні тав. Гарэгляд прапануе прыняць рад мерапрыемстваў для паляпшэньня фінансавай работы прафсаюзаў і работы апарату.

⊙ Пасьля дакладу рэвізійнай камісіі разгарнулася спрэчкі па дакладах Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі і рэвізійнай камісіі. На ранішнім паседжаньні ў спрэчках выказаліся 21 дэлегат.

⊙ Першым у спрэчках выступіў т. Фароман (Чэрвеньчына), які адзначыў, што ЦСПСБ мала зьвяртаў увагі рабоце прафарганізацый малых раёнаў. Слаба было пастаўлена жывое апэрацыйнае кіраўніцтва ЦСПСБ.

⊙ Тав. Плоткін (Менск) гаварыў аб неабходнасьці дапамогчы будаўніцтву дарог. Над тымі вучасткамі будаўніцтва, над якімі ўзялі шэфства прафарганізацыі мы маем добрыя вынікі. Неабходна ўмацаваць прафработу на будаўніцтве дарог.

⊙ Тав. Катлярскі (Жлобін) спыніўся на рабоце прафарганізацыі на транспарце і на посьлехах, дасягнутых на транспарце дзякуючы перабудове прафработы і перавядзеньню яе непасрэдна ў брыгаду.

⊙ Тав. Статкевіч (Барысаўскі завод імя Домбаля) гаварыў аб дасягненьнях, якія ёсьць у сувязі з перабудовай прафработы.

— Калі мы ў 1931 годзе мелі значнае недавыкананьне пляну, дык зараз плян за люты і за першую дэкаду сакавіка мы перавыканалі. Асобныя гаспадарча-разьліковыя брыгады выканалі свой плян на 140 проц. Зьмена імя Сталіна выканала свой прамфінплян на працягу апошніх трох месяцаў на 145 проц. Недастаткова яшчэ—гаворыць тав. Статкевіч,—у нас разгорнута работа па палепшаньні сацыяльна-бытавых умоў рабочых. Неабходна павялічыць жыльлёвае будаўніцтва.

⊙ Дэлегатка шэйнай фабрыкі імя Камінтэрна (Віцебск) тав. Гадаскіна ў сваім выступленьні зьвяняецца на барацьбе за прамфінплян прафарганізацыі сваёй фабрыкі.

⊙ Тав. Міруц (ЦК Леспрэўрабочых) падкрэсьлівае, што ў нас яшчэ недастаткова налажана кіраўніцтва прафгрупай. Ня спыняецца на рабоце па перабудове заработкі і тарыфнага нармаваньня працы. Прафсаюзныя арганізацыі недастаткова займаюцца гэтым пытаньнем.

Далей т. Міруц гаворыць аб культрабоце ў леспрамгасах. На гэту справу мы адпусьцілі шмат сродкаў, але-ж яны нятраўільна скарыстоўваюцца, дзякуючы чаму культработа кульгае.

⊙ Тав. Магендовіч—гаворыць аб вайсковай рабоце прафсаюзаў. Гэта работа да апошняга часу недастаткова праводзілася сярод членаў прафсаюзаў. Неабходна, каб прафарганізацыі ўлічылі важнасьць гэтай работы, узялі вайсковую работу на належную вышыню.

⊙ Зьезд, перад сканчэньнем раніцняга паседжаньня, заслухаў прывітаньне ад рабочых прыгараднай гаспадаркі «Новы сьвет» (Віцебск).

⊙ Зьезадам былі прыняты прывітальныя тэлеграмы УсеЦСПС і Рэвэнсавету.

Вылучэньнем дэлегацыі на менскія прадпрыемствы скончылася дзённае паседжаньне 17-га сакавіка.

⊙ На вячэрнім паседжаньні 17-га сакавіка працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Рыжова і Гарэгляда.

У час вячэрняга паседжаньня зьезд вітала вялікая дэманстрацыя рабочых-будаўнікоў Дому Ураду.

Зьезд нафраваў 35 дэлегатаў у саўгасы для дапамогі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Выступленьне сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЁКАЛО

17-га сакавіка на вячэрнім паседжаньні VII-га Ўсебеларускага зьезду прафсаюзаў з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. Гёкало.

Тав. Гёкало быў сустрэчны дружнымі гучнымі воплескамі дэлегатаў зьезду.

***

Учора на дзённым паседжаньні працягваліся спрэчкі па дакладах ЦСПСБ і рэвізійнай камісіі. У спрэчках прымалі ўдзел т. т. Бэнэнсон (Віцебск), Іоффэ (рабочы-будаўнік). Масарскі (Полацк), Гэфнэр (Клімавічы), т. Клім ковіч і інш.

⊙ З вялікай прамовай аб задачах прафсаюзаў у барацьбе за выкананьне фінплану 4-га заключнага году пяцігодкі выступіў Нарком фінансаў тав. Хацкевіч.

Зьезадам была прынята пастанова, якая абавязвае прафарганізацыі рашуча ўзмацніць работу па выкананьні фінплану.

У канцы дзённага паседжаньня ў заключнай прамове выступіў тав. Рыжоў.

Учора пасьля заключнага слова тав. Рыжова зьезадам была прынята пастанова, у якой адзначана, што VII Усебеларускі зьезд прафсаюзаў прызнае палітычную лінію ЦСПСБ правільнай і практычную работу яго здавальняючай.

⊙ На вячэрнім паседжаньні 18 сакавіка з дакладам выступіў старшыня ВСНГ т. Грысевіч.

Зьезд прызнаў палітычную лінію УсеЦСПС правільнай і практычную работу здавальняючай

Заслухаўшы справаздачны даклад тав. Баярскага аб рабоце УсеЦСПС за перыяд ад VIII усесаюзнага зьезду прафсаюзаў, VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў прызнае палітычную лінію УсеЦСПС правільнай і практычную работу здавальняючай.

Усебеларускае спаборніцтва раёнаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне трэцяй бальшавіцкай

Пробнымі выездамі ў поле-

перадавыя калгасы правяраюць падрыхтаванасьць да сяўбы

Засыпка насенфондаў—першая рашаючая ўмова гатоўнасьці да сяўбы

19 сакавіка

Сяўба набліжаецца. Сяўба павінна быць раньняй, тэрміны сяўбы—максымальна кароткімі. Толькі раньняя сяўба забясьпечвае падвышэньне ўраджайнасьці. Вось чаму дзень выхаду ў поле мы павінны спаткаць у поўнай гатоўнасьці.

Каб забясьпечыць раньнюю сяўбу, а гэта значыць дабіцца падвышэньня ўраджайнасьці,—трэба ў бліжэйшыя дні завяршыць засыпку насенфондаў.

Практыка лепшых паказала, што цэнтр барацьбы за насеньне,—трэба перанесьці ў асноўную гаспадарчую адзінку калгасу—у сталую вытворчую брыгаду. Калгасная брыгада, за якой замацаваны пэўны зямельны вучастак, за апрацоўку якога яна адказвае і непасрэдна зацікаўлена ў выніках работы на гэтым вучастку,—павінна дабіцца таго, каб спаткаць сяўбу ў поўнай гатоўнасьці, каб насенфонд—асноўная ўмова гатоўнасьці быў засыпан у тэрмін.

У тэрмін засыпаць насенфонды, правільна арганізаваць працу на аснове стварэньня сталых вытворчых брыгад, падрыхтаваць цягавую сілу і інвэнтар,—вось асноўныя стрыжнёвыя вагары барацьбы за гатоўнасьць да выхаду ў поле.

Перадавыя калгасы ня толькі поўнасьцю засыпалі насенфонды і наладзілі правільную арганізацыю працы на аснове стварэньня сталых вытворчых брыгад, але падрыхтавалі да выхаду ў поле інвэнтар, збрую і цягавую сілу. Гэтыя калгасы удасканальваюць сваю падрыхтоўку, правяраюць сваю гатоўнасьць да сяўбы шляхам арганізацыі пробных выездаў у поле. Пробныя выезды—гэта экзамен—праверка, як калгас падрыхтаваўся да сяўбы, дзе слабыя месцы ў гэтай падрыхтоўцы.

Сваячасова арганізаваны пробны выезд у поле дасьць магчымасьць выкрыць недахопы ў падрыхтоўцы з тым, каб да пачатку сяўбы іх выправіць.

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, канкрэтнымі фактамі паказваюць, як трэба па-бальшавіцку рыхтавацца да сяўбы—па-бальшавіцку змагацца за пасьпяховае правядзеньне сяўбы—за бальшавіцкі ўраджай.

Гэтыя ўзоры ўдарнай падрыхтоўкі да сяўбы мы павінны перанесьці ва ўсе раёны, ва ўсе сельсаветы, ва ўсе калгасы і калгасныя брыгады.

Усебеларускае спаборніцтва раёнаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы, у якое ўключаецца раён за раёнам,—павінна зьявіцца магутным мэтадам барацьбы за перанесеньне вопыту перадавых у адстаючыя, за «таварыскую дапамогу адстаўшым з боку перадавых з тым, каб дабіцца агульнага ўздыму» (Сталін).

Пастанова цэнтральнай конкурснай камісіі пры „Зьвязьдзе"

У дадатак да параду прэміраваньня па конкурсе «Правды» (надрукаваны ў «Рабселькоры» № 8-71) цэнтральная конкурсная камісія пры «Зьвязьдзе» пастанавіла вызначыць сельсаветам, самым сельсавету, дэпутацкім групам у прадпрыемствах, саўгасах, калгасах і МТС за лепшую работу па конкурсе «Правды» адзін пераходны сьцяг імя газэты «Савецкая Беларусь», радыёфікацыю 2-х дамоў сацыялістычнай культуры і 2 месцы ў вытворчай экскурсіі ў буйнейшыя прамысловыя гарады СССР.

Цэнтральная конкурсная камісія.

Полацкі раён прыняў выклік Лепеля

Будзем змагацца за сацыялістычнае пяршынства

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Заслухаўшы паведамленьне аб выкліку Лепеля на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні трэцяй бальшавіцкай сяўбы сакратарыят РК КП(б)Б пастанавіў выклік прыняць.

У раёне створан штаб па арганізацыі і правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва. На мясцох—у сельсаветах і калгасах праводзіцца шырокая масавая растлумачальная работа аб важнасьці сацыялістычнага спаборніцтва з Лепельскім раёнам на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

У раёне распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы—плян арганізацыі і разгортваньня сацспаборніцтва. Гэтымі днямі чакаецца прыезд брыгады з Лепеля для заключэньня сацыялістычнага дагавору.

Полацкі раён ударна будзе змагацца за пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай сяўбы,—за сацыялістычнае пяршынства, — за права атрымаць пераходны сьцяг імя X зьезду саветаў БССР.

ЯКІМ ЗОРНЫ.

5-дзеньнік рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Ухваліць ініцыятыву газэты «Рабселькор» і раённых газэт Гомелю, Буда-Кашалёва і Віцебску па выданьні аблігацый насеннай пазыкі, як адно з дзейсных сродкаў апэрацыйна-масавай работы па зборы і ссыпцы насенных і страхавых фондаў.

2. Абвясьціць па БССР 5-дзеньнік па распаўсюджваньні і рэалізацыі насеннай пазыкі, зрабіўшы пяцідзеньнік справаю ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР.

3. Абавязаць ГК, РК КП(б)Б і партыйныя ячэйкі, увесь цэнтральны, раённы і мізавы друк безадкладна разгарнуць самую шырокую масавую работу па рэалізацыі пазыкі і, ў прыватнасьці, сыстэматычна зьмяшчаць апэрацыйныя зводкі аб рэалізацыі пазыкі.

Пробным выездам „Колас" праверыў сваю баявую гатоўнасьць да трэцяй бальшавіцкай

МАГІЛЕЎ. 17-III. Калгас «Колас» Гарадзішчанскага сельсавету арганізаваў гатовымі днямі пробны выезд у поле. Пробны выезд прайшоў з вялікім уздымам калгаснікаў, а таксама беднякоў і сераднякоў-адноасобнікаў, у выезьдзе ўдзельнічала каля тысячы чалавек.

Выезд паказаў, што калгас дабіўся добрай падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Да пробнага выезду калгас «Колас» прышоў з наступнымі паказьнікамі: пасеўны плян яравых культур у 657 га прыняты і высунуты сустрэчны на 130 га, уся пасеўная плошча забясьпечана насеньнем, якое адсартавана, ачышчана і хаваецца ў складах.

Калгас арганізаваў фонд дапамогі іншым калгасам і порадаў апошнім 18 цнт. насеньня.

Рамонт інвэнтара скончаны. Адрамонтавана 163 плугоў, 170 баронаў, 159 калёс і ўсе с.-г. машыны. Калгасныя разьбіты на сталыя вытворчыя брыгады. Па паляводзтву арганізаваны 2 брыгады. Вылучаны адказныя брыгадзіры. Да брыгад прымацаваны вучасткі, коні, збруя і інвэнтар.

Распрацаваны вытворчыя пляны брыгад і разьмеркаваньня работ сярод калгаснікаў унутры брыгад. Брыгада па гародніцтву арганізавана ў ліку 62 чал., з іх 46 жанчын. Да брыгады прымацаваны інвэнтар і гародніна прылады.

Арганізавана таксама брыгада на МТФ калгасу з 17 чал. Ударна ўзялася за вывазку гною брыгада па паляводзтву. Ужо вывезена 1000 вазоў, што складае 50 проц. квартальнага заданьня. Брыгада па паляводзтву павінна ўмацаваць работу па вывазцы гною з тым, каб у бліжэйшыя дні выканаць квартальнае заданьне.

Усе калгаснікі калгасу «Колас» абвясьцілі сябе ўдарнікамі ў правядзеньні трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Прыклад бальшавіцкай барацьбы калгасу «Колас» павінен быць падхоплен усімі калгасамі. (Бэлта).

ПРЫ УДЗЕЛЕ ШЫРОКІХ ПРАЦОУНЫХ МАС

па бальшавіцку змагацца за моцны, гнуткі савецкі апарат

Бюракратам, прагульшчыкам і гультаям ня месца ў савецкіх установах

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ял аб выніках рэйду „налёту", які быў нядаўна праведзены аб'яднаным бюро скаргаў ЦК КП РСІ БССР і газэтамі „Зьвязда", „Савецкая Беларусь" і „Рабочай", з мэтаю выяўленьня становішча працдысцыпліны, якасьці абслугоўваньня наведвальнікаў і тва. у работнікаў савецкіх устаноў Менску.

У гэтым рэйдзе „налёце" удзельнічала 680 рабочых менскіх прадпрыемстваў—актыву РСІ, ударнікаў друку.

Як відаць з друкуемых ніжэй матар'ялаў, у большасьці праверяных установаў, працдысцыпліна яшчэ далёка не на вышыні, абслугоўваньне наведвальнікаў, у радзе выпадкаў, надзвычайна дрэннае. Некаторыя савапараты засьмечаны бюракратамі, якія зрываюць нармальную і „правільную работу ўстановы.

Вынікі рэйду павінны зьявіцца вурокам, павінны быць у ячокы ўсімі цэнтральнымі і раённымі савецкімі ўстановамі БССР

Працдысцыпліна адсутнічае

Н. К. Асьветы

Наша брыгада, якая працавала ў НКАсьветы выявіла, што працаўнікі НКА вельмі няўважліва адносяцца да наведвальнікаў, адсылаюць іх ад стала да стала і ніхто з работнікаў не дае належных адказаў на запытаньні.

У дзень нашага наведваньня НКА большая частка супрацоўнікаў на работу прыйшла з вялікім спазьненьнем, а пяць асоб зьявіліся са спазьненьнем ад 1 да 3-х гадзін. Асабліва спазьнілася інспэктар палітасьветы (на 2 гадзіны), якога чакала 6 наведвальнікаў і кіраўнік групы мастацтва—на 3 гадзіны. Дзе яны былі ў гэты час ніхто з супрацоўнікаў ня ведаў.

Вучоту як спазьненьняў, так і дазтэрміновага ўходу з работы не вядзецца. Рабочы час супрацоўнікаў не загружаны. Перад пачаткам работы супрацоўнікі зьбіраліся групамі і абменьваліся навінамі і ўраджаньнямі. **Тав. Данэйка** прывёз свой фотаздымак, каля яго сабралася група ў 10 чал. і на працяту 15 хвілін дыскусавалі аб фотаздымку.

Такім бяздушным адносінам да заяў нават нельга знайсьці і тлумачэньня.

Брыгада: **Савіцкая, Скудовіч, Шульман, Мігаленя, Зэйфман.**

НКЗем

На лепш справа ў галіне працдысцыпліны наладжана ў НКЗБ. Брыгада ў складзе т. т. **Васільеў, В. Васількоў, Уладыкоўскі, Каганская,** зьявілася ў НКЗБ роўна а 9-й гадзіне раніцы. Спазьненьні супрацоўнікаў па работу на 10—15 хвілін было агульным зьявішчам. Вучоту прыходу на работу, уходу з работы і прагульшчыкаў са сьнежня мінулага году не вядзецца. Работнікі ў часе работы займаліся старонняімі размовамі. Работнік статыстычнага бюро **т. Шайчук** на працягу 2-х гадзін ставіў у калідоры і раз маўляў з невядомым таварышом.

Бюракратычныя адказы—звычайнае зьявішча ў апараце НКЗБ. Калі адзін наведвальнік папрасіў у сакратара сэктару кадраў тав. **Праташэвіча** пашукаць яго дакументы, дык ён адказаў **«зараз прыдзе другі таварыш, дык пашукае».**

Загадчык земчасткі тав. **Панварскі** адказаў наведвальніку на яго зварот сказаў, **«пасядзі пачакай»,** а сам пайшоў невядома куды і не зьявіўся на працягу цэлай гадзіны.

У табінэтах наркома, намесьнікаў і загадчыкаў сэктароў адсутнічаюць нямыя дзведкі аб прыёме наведвальнікаў.

На заўвагу аб тым, што ў НКЗБ ад сутнічае кніга скаргаў, сакратар ячэйкі КП(б)Б адказаў: **«я ня ведаю навошта яна (кніга скаргаў) наогул існуе».**

З дасягненьняў у апараце НКЗБ трэба адзначыць: перавод на зьдзельную аплату працы машыннага бюро, дзякуючы чаму значна палепшылася работа машыністак.

Замест работы—забаўляюцца анэкдотамі

Дзяржплян

У Дзяржпляне працдысцыпліна не на належнай зьпшыні. Работнікі прыходзяць і ўходзяць калі каму ўздумаецца. Аб гэтым сьведчаць такія факты: у сэктары кан'юнктуры ў дзень наведваньня яго брыгадай сталы былі пустымі і працаваў толькі адзін практыкант. Загадчыка гэтага сэктару брыгада чакала 25 хвілін і калі яго запыталі, дзе людзі, дык ён злідна вылаяўся і сказаў: **«многа такіх, як вы, балзяецца, дык кожнаму ня будзеш даваць справаздачу».** Калі брыгада паказала мандат ад аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ, ён **прыкінуўся нянісьменным (?!).**

У адным з габінэтаў (бяз надпісу) каля печы стаяла 14 супрацоўнікаў і грэлася. Разам з імі стаяў і загадчык сэктару тав. **Альпэровіч** і забаўляў іх сьмешнымі анэкдотамі.

Брыгада з абурэньнем адзначае супрацўленьне ўжываньню беларускай мовы ў Дзяржпляне. Усе работнікі Дзяржпляну, як паміж сабой, так і з наведвальнікамі гутараць толькі на расійскай мове.

Важнейшыя дырэктывы марынуюцца ў апараце

Наркамснаб

Брыгада ў складзе пт. **Цвэйгацінава, Рагоціна, Дордзіка і Пархаменка** ў апараце НКСнабу БССР выявіла, што спазьненьні на работу маюць сыстэматычны характар. Вучоту яўкі на работу не вядзецца.

У рэгістратуры адсутнічае чоткая работа па разьмеркаваньні пошты па сэкторох, і з прычыны гэтага, матар'ялы засылаюцца ня ў тыя сэктары, што шкодзіць апэрацыйнаму кіраўніцтву.

У НКСнабе ёсьць сэктар праверкі і кантролю выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па прамысловасьці НКС, але няма праверкі і кантролю выкананьня таго, як гэтыя дырэктывы ажыцьцяўляюцца ўнутры апарату. У сярэдзіне лютага яшчэ ня быў спушчаны загад тав. **Мікаяна** ад 10 студзеня 1932 г. Пастанова ЦК аб дыфэрэнцыяваным кіраўніцтве раённамі ляжала ў апараце і аб ёй ніхто ня ведаў на працяму амаль двух тыдняў.

У памяшканьні цесна: па 2-3 работнікі працуюць за адным сталом, што ўраўмела ня можа не адбіцца на прадукцыйнасьці і якасьці работы.

Апроч гэтага, у НКСнабе зьялі не дахват работнікаў. Напрыклад, па галіне мясной выпэрчасьці працуе 1 інспэктар на 75 раёнаў. Зразумела, такое становішча са штатам ня можа спрыяць чоткаму апэрацыйнаму кіраўніцтву як прадпрыемствамі так і райснабамі.

Зараз праходзіць прыём новых работнікаў. Аднак з гэтым новым папаўненьнем не вядзецца ніякай выхаваўчай работы, фактычна яны прадстаўлены самі сабе.

Наогул культфінзыхаваўчая работа сярод работнікаў мясцкомам не праводзіцца.

Фрынклер уцякае ад наведвальнікаў

Праўленьне МЦРК

Тт. **Казакевіч і Брагінскі** наведалі апарат МЦРК. Вось што выявіла гэтая брыгада: 19 лютага адказныя выкананцы на групах: прамгрупы тав. **Алер** і прадукцыйнай групы тав. **Гольдзіна** адсутнічалі. Ля іх сталоў стваралися чаргі, з 8-10 чалавек, якія чакалі іх 2 гадзіны, а калі дачакаліся, дык не адзін з пайнікаў не атрымаў дакладнага адказу.

Член праўленьня т. **Фрынклер** пасылаў пайнікаў да **Васілевіча** па пытаньні прымацаваньня да магазынаў, а тав. **Васілевіч** пасылаў зноў да тав. **Фрынклера.** Гэта паўтаралася 3 разы. Калі пайнікі зьвярнуліся ў чацьверты раз да **Фрынклера,** дык апошні... даў запіскі аб прымацаваньні да крам.

Нямыя дзведкі адсутнічаюць і па гэтай прычыне наведвальнікі прымушаны хадзіць ад стала да стала у по шуках патрэбнага ім работніка. Калі прыходзяць і калі ўходзяць з работы адказныя работнікі—ніхто ня ведае.

Абураючы ўчынак зрабіў член праўленьня **Фрынклер.** Ён кінуў адкрыты стол і ўцёк з габінэту з тэй мэтаю, каб не адказваць наведвальнікам, якія засталіся ў габінэце.

Нельга абыйсьці міма такіх абураючых, нічым не апраўдваемых паводзін сакратара ячэйкі КП(б)Б апарату МЦРК, які катэгарычна адмовіўся даць адказ на запытаньні і патрабаваў брыгадзірам выклікаць работнікаў ДПУ для арышту іх.

„У нас усё добра і кніга скаргаў нам не патрэбна"

Белгандаль

Пры наведваньні Белгандлю члены брыгады т. т. **Серпень, Лядман і Бардзіюляй** былі сьведкамі агіднага факту ня толькі бюракратызму і цераніны, а проста нічым неапраўданага машэнства, з боку загадчыка гаспадаркай **Левіна. Левінам** была нанята група рабочых па возцы лёду. Заключана ўмова, што кожны рабочы за 2-зьменную работу атрымае 10 руб. Але, калі работа была скончана, ён разьлічыў рабочых па 7 р. 50 кап. Рабочыя больш 10 дзён ходзяць за грашыма.

Супрацоўнікі на работу зьяўляліся несвоечасова. Табельная дошка вісіць без скарыстаньня. Работнікі апарату Белгандлю зьбіраліся групамі па пакоях і займаліся гутаркамі аб забясьпечаньні. Да адзнай з такіх груп брыгада зьвярнулася з просьбай даць кнігу скаргаў, але ім адказалі **«у нас усё добра і кніга скаргаў нам непатрэбна».**

Прагулы ўлічваюцца, а прагульшчыкі да адказнасьці не прыцягваюцца

Белкалгасцэнтр

У апараце Белкалгасцэнтру заведзены вучот яўкі на работу, але на вучот узята толькі 64 работнікі, а ас татнія 120 работнікаў зусім ня ўлічаны. Чым тлумачыцца такі падзел работнікаў, брыгадзе не ўдалося устанавіць. Аднак, з улічаных 64 чалавек, у лютым г. г. маюцца такія вынікі: прагулаў—17, спазьненьняў 71 Прагулы і спазьненьні ўлічаны, але на гэта ніхто не рэагуе.

Да такіх прагульшчыкаў, як т.т.: **Чыкмараў**—8 прагулаў, **Яўхімава**—5 дзён, **Кульскі**—3 дні, **Лазарэнка** — 1 дзень і спазьняючыхся: **Любашэўскі**—8 раз па 15 хвілін, **Круглай**—4 разы па 15 хвілін і адзін раз на 30 хвілін—трэба было-б прыняць рашучыя меры.

Рабочы дзень работнікаў недастаткова загружаны. Чырвоная і чорная дошка адсутнічаюць, адсутнічае і кніга скаргаў.

Брыгада: **Камінскі, Гарэлік, Каталянкіна.**

Белдзяржкіно і Мендзяржкіно

Гэтыя ўстановы наведала брыгада ў складзе т. т. **Куперава і Рубінчыка.**

За люты было ўлічана спазьненьняў ў агульнай колькасьці на 10½ гадзін. Сыстэматычна спазьняюцца наступныя т. т.: загадчык забясьпечаньня **тав. Біргер,** рахункавод **тав. Выхадцаў,** інспэктар **Эйдус.** Таксама ёсьць весткі і за мінулыя месяцы, напрыклад, у студзені спазьненьняў было на 29 гадз. і 45 хвіл., а ў сьнежні на 20 гадз. 15 хв. Трэба адзначыць, што спазьненьні фіксуюцца, але барацьба са спазьненьнямі не вядзецца. У часе работы брыгады 20-га лютага работнікі прыступілі да выкананьня сваіх абавязкаў праз 20 хвілін пасьля прыходу. Да гэтага часу яны займаліся прыватнымі гутаркамі.

Загадчык сэктару кадраў 19 лютага адсутнічаў увесь дзень і ніхто ня ведаў прычыны яго адсутнасьці. Інспэктар **Бельскі** адсутнічаў 2 гадзіны.

Прафарганізацыя ў баку ад барацьбы за працдысцыпліну

ТЭЦ (Цёплаэлектрацэнтраль)

Вучот яўкі на работу і своечасовага ўходу з работы, а таксама вучот прагульшчыкаў у апараце ТЭЦ адсутнічаюць.

Работнік сэктару кадраў **Якубовіч** дрэнна адносіцца да работы. Бюракратычна адказвае на запытаньні. Па яго віне некалькі рабочых зрабілі прагул, бо ён зацягваў спрэчную справу гэтых рабочых.

Бюракратычныя і нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў праявіле пра раб будаўніцтва ТЭЦ **тав. Васільеў,** які дае недакладныя і блытаныя распараджэньні.

Рабачком абмежаваўся толькі тым, што адзін раз за ўвесь час на агульным сходзе паставіў пытаньне аб працдысцыпліне. Насьцепаэта не раз гарнула дастатковай барацьбы за ўзьняцьце працдысцыпліны. З прычыны няўважлівых адносін з боку адміністрацыі і прафарганізацыі будаўніцтва ТЭЦ рабочыя дрэнна забясьпечваюцца прадуктамі харчаваньня. Грамадзкае харчаваньне—вельмі дрэннае, абеды халодныя, пахнуць дымам.

Брыгада: **Шчарбачэвіч, Станкевіч, Сосін.**

Не жадаюць адказваць на запытаньні наведвальнікаў

Белрыбтрэст

Брыгада т. т. **Бурава і Пахомава** ў апараце Белрыбтрэсту зьвяжыла, што спазьненьні на работу зьяўляюцца сыстэматычным зьявішчам. Асабліва ў гэтым больш усяго праяўляе сябе мацыністка **тав. Гілярэвіч,** якая наогул ня лічыцца з працдысцыплінай. Гідратэхнік **тав. Рант** адчуўае сябе як ва ўласным доме. У часе заняткаў худы хоча, туды і ідзе. Яго прыкладу сьледуюць работнікі **Бранавіцкі, Малкевіч і Караліцкі.**

Груба адносіцца да наведвальнікаў загадчык складу тав. **Шахцёнак.** Ён выганяе наведвальнікаў з пакою, нават штурхаючы ў грудзі, зусім не жадае даваць тлумачэньні наведвальнікам. Нямыя дзведкі, як правіла, адсутнічаюць. Барацьбы з прагуламі прафарганізацыя не вядзе.

Брыгада пацікавілася выкананьнем пляну завозу рыбы ў Менск, але на вялікі жаль, ніхто на гэтае пытаньне не адказаў, бо наогул плян на 1932 г. ня складзены.

Прафарганізацыя і газэта дабіліся моцнай працдысцыпліны НК Сацабесьпячэньня

У апараце наркамату сацзабесьпячэньня працдысцыпліна пастаўлена здавальняюча. Зусім ліквідаваны прагулы. Рабочы час скарыстоўваецца добра. Дзведкі наведвальнікам даюцца вычарпальныя. Грубых адносін з боку супрацоўнікаў да наведвальнікаў не заўважана.

Падвяцьце працдысцыпліны тлумачыцца тым, што мясцком сумесна з насьцепгазэтай павялі рашучую барацьбу за працдысцыпліну. Кожнае спазьненьне абгаварваецца на МК.

Недахопам у рабоце гэтай установы зьяўляецца тое, што недастаткова наладжана культвыхаваўчая работа сярод членаў саюзу не наладжан сталы выхад насьцепгазэты.

Брыгада: **Гарошка, Ваўчок, Бусьлейка.**

За суцэльна-пісьменную БССР

Раўняцца па Гомелю, Менску, Полацку і Чэрвеню—перадавікох барацьбы за суцэльную пісьменнасьць

Пасьледвіць прыкладу перадавых гарадоў і раёнаў

(Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Асьветы)

Калегія НКА адзначае, што органы Нарасьветы гарадоў **Гомелю, Віцебску, Менску і раёнаў Полацкага, Чэрвенскага** забясьпечылі сапраўднае канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва, ўзьнялі баявы тэмп работы ў справе ліквідацыі нянісьменнасьці, мабілізавалі шырокую пралетарскую грамадзкасьць, дзякуючы чаму дабіліся вялізарных посьпехаў у справе выкананьня пастановы партыі і ўраду аб ператварэньні гарадоў і раёнаў у суцэльна-пісьменныя.

Гомельскі гарана разам з усёй пралетарскай грамадзкасьцю забясьпечыў ператварэньне шэрагу прадпрыемстваў у суцэльна-пісьменныя; г. Гомель першым дабіўся 100 проц. ахопу навучаньнем (да 12-й гадавіны Ленінскага дэкрэту) і знаходзіцца напярэдадні завяршэньня суцэльнай пісьменнасьці. Разгорнута шырокая масавая работа: сходы, канфэрэнцыі, зьлёты, паходы (школьнікаў, піянэраў, фізкультурнікаў), самаштурмы навучаючыхся, накіраваны буксірныя брыгады ў адстаючыя раёны (Рэчыцкі, Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі). Дасягнуты значныя посьпехі у галіне ўзьнятьня якасьці працы.

Узнагарадзіць **Гомельскі гарсавет адчыненьнем вячэрняга рабочага Універсытэту з 1-X—1932 году.** Загадчыка гарана тав. **Сілова** прэміраваць 200 руб. і ганаровай граматай Наркамасьветы. Інспэктара палітасьветы тав. **Паташкіна** ў дадатак атрымаўшы прэмію ад ЦСПСБ выдаць ганаровую грамату НКА. Прэміраваць лепшых культармейцаў ударнікаў рабочых заводу імя Ланцуцкага **т. Фрэйдзіна,** рабочага ф-кі **«Праца»—т. Захарчанка** і культармейцаў Беньдгун па 100 руб. і ганаровымі граматамі НКА.

Віцебскі гарана забясьпечыў прыцягненьне шырокай пралетарскай грамадзкасьці, разгарнуў масавую работу на прадпрыемствах, дабіўся ператорэньня раду прадпрыемстваў у суцэльна пісьменныя і ахапіў звыш 90 цэльна пісьменныя і ахапіў звыш 90 проц. усіх нянісьменных па горадзе. Арганізаваў работу з культармій (культармейскі ўнівэрсытэт), разгорнута работа сярод нацменшасьцяй на іх родных мовах, узяў на грамадзкі буксір Магілеў і Сураскі раён. Прэміраваць заахвачвацца ліквідацыя нянісьменнасьці ў гор. Полацку. Выдаць райана ганаровую грамату; прэміраваць інспэктара палітасьветы тав. **Іванову**—200 руб. і ганаровай граматай. Лепшых культармейцаў-ударнікаў настаўніцу **Галубцову,** калгасьніка **Восіпава** па 100 руб. кожнага і ганаровай граматай.

Адзначыць заачную работу, праведзеную Чэрвеньскім раёнам, які мабілізаваў і прыцягнуў да ўдзелу шырокую грамадзкасьць арганізаваў работу з культармейцамі, з дапрызыўнікамі—за што выдаць раёнам ганаровую грамату і прэміраваць тав. АНА тав. **Зенькевіча** 200 руб., лепшага культармейца тав. **Барысевіча**—100 руб. і ганаровай граматай.

Калегія НКАсьветы зьвяртае асаблівую ўвагу гарадзкіх і раённых АНА на неабходнасьць: далейшага замацаваньня дасягнутых посьпехаў, яшчэ больш упартай работы па замацаваньні нянісьменных за ліквпунктамі, 100 проц. штодзённага наведваньня, ўзьнятьня якасьці працы. Забясьпечыць ператварэньне гарадоў і раёнаў да 1-га мая 1932 г. у суцэльна-пісьменныя.

Калегія НКА заклікае ўсе раённыя аддзелы нарасьветы, усіх асьветнікаў і ўсю савецкую грамадзкасьць пасьледаваць прыкладу перадавых гарадоў і раёнаў, мабілізаваць усе сілы і сродкі на барацьбу за ператварэньне БССР да 1-га мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Слова за Старадарокай КК-РСІ

«Савецкая Беларусь» перад раённымі арганізацыямі Стара - Дароскага раёну паставіла рашучу пытаньне аб тым, каб усе сілы і сродкі кінуць на ліквідацыю прарываў у справе барацьбы за суцэльную пісьменнасьць. Але паасобныя арганізацыі раёну не зрабілі з гэтага адпаведных вываадаў.

Старшыня **Крываносаўскага** сельсавету да гэтага часу адмахваецца ад лікбезу, лічучы гэтую работу другарадная справай.

Па прыкладзе старшыні сельсавету ідуць і паасобныя асьветнікі. Больш таго, загадчык Крываносаўскай ШКМ Ярота заявіў: **«што-ж мы будзем рабіць у 1933 годзе, калі ліквідуем нянісьменнасьць сёлета».** Гэтай кулацкай вылазцы ня дадзена адпору.

У выніку ўсяго гэтага на сельсавеце больш паловы нянісьменных не на ведваюць ліквпункты, якасьць работы апошніх зусім дрэнная, ня ўведзены паліт і агразоатэхгадзіны.

Мы пісалі аб прарывах у Стара - Дароскім раёне. Зараз слова прадстаўляецца КК-РСІ. Вінаватыя ў агнараваньні дырэктыў партыі і ўраду павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Разам з тым мы патрабуем ад райвыканкому прыняць меры да неадкладнага зьнішчэньня прарываў у Крываносаўскім сельсавеце.

С. Жыліцкі.

Рашуча біць па апартуністычным самацёку

СЯННО (наш кар). **Латыганьскі, Сеньненскі, Алексініцкі, Навасельскі** сельсаветы справу ліквідацыі нянісьменнасьці ганебна правальваюць. У гэтых сельсаветах ахоп нянісьменных і малапісьменных ліквпунктамі не перавышае 70 проц.

Калгасныя, прафсаюзныя і кааперацыйныя арганізацыі лічаць, што справа лікбезу—справа адзелу нарасьветы і настаўніцтва і ніякай практычнай дапамогі не аказваюць.

У большасьці ліквпунктаў ня ўведзены паліт. і аграгадзіны; нянісьменныя не мабілізуюцца на барацьбу за ўдарную падрыхтоўку да 3-й бальшавіцкай вясны.

У Сеньненскім раёне ёсьць і такія сельсаветы, якія справу ліквідацыі ня пісьменнасьці пакінулі ў цэнтр сваёй увагі. Гэтыя сельсаветы дабіліся значных посьпехаў у сваёй рабоце. Так Хадчанскі і Машчанскі сельсаветы дабіліся 100 проц. ахопу нянісьменных вучобай. Расьнянскі—98 проц., Нямойценскі 95,7 проц., Сідарніцкі—95 проц.

Усе сельсаветы Сеньненскага раёну павінны ўзяць прыклад з перадавых з тым, каб у бліжэйшы час дабіцца 100 проц. ахопу вучобай усіх нянісьменных.

Сеньненскі раён мае ўсе магчымасьці для таго, каб выканаць дырэктыву партыі аб ператварэньні раёну ў суцэльна пісьменны.

Б. Зяневіч.

Ячэйка саўгасу Вязань-Фаніпаль не змагаецца з нянісьменнасьцю

КОЙДАНАВА. Партячэйка і рабфком саўгасу **Вязань-Фаніпаль** не займаюцца пытаньнем ліквідацыі нянісьменнасьці сярод рабочых саўгасу.

У саўгасе налічваецца больш як 50 нянісьменных і малапісьменных, пало ва якіх не наведвае заняткаў. На ліквпунктах няма падручнікаў і пісьмовых прыладаў.

На вучобку Барэйна ліквпункт зусім не арганізаваны, ня гледзячы на тое, што там налічваецца 18 нянісьменных і 9 малапісьменных.

У саўгасе ёсьць усе ўмовы для работы ліквпунктаў, ёсьць адпаведныя кіраўнікі, але гэтыя малапісьменныя не скарыстоўваюцца.

Брыгада «Сав. Бел.»

Тупіцін, Шут.

ПЯЦІДЗЁНЬНІК БЮРО СКАРГАЎ РСІ

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Калегіі НК РСІ Бел. ад 5-III 1932 году

У ажыцьцяўленьне пастановы Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і Калегіі НК РСІ СССР аб правядзеньні 5-дзёньніка па рабоце бюро скаргаў,—прэзыдыум ЦКК і Калегія НК РСІ пастанаўляюць:

1. Правесьці ва ўстаноўленыя ЦКК УсеКП(б) тэрміны з 9 па 14 красавіка 5-ці дзёньнік работы аб'яднанага БС НК РСІ і БС усіх гарадзкіх і раённых НК—РСІ.

2. Падрыхтоўку і правядзеньне 5-ці дзёньніка правесьці, як масавую палітычную кампанію па далейшым разгортваньні ўсёй масавай работы НК-РСІ (рабоч. засядан., груп садзейнічаньня, пастаноў бюро скаргаў, сэкцыі РСІ, «ЛК» і інш.), яшчэ большаму ўцягненьню рабочых, калгасьнікаў, асабліва жанчын у працу РСІ па барацьбе з бюракратычнымі скажэньнямі апарату, па праверцы фактычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду і ўцягненьне шырокіх працоўных мас у непасрэдную справу па кіраўніцтву дзяржавай.

3. 5-ці дзёньнік, на падставе выяўленьня шляхам самакрытыкі ўсіх памылак і істотных недахопаў у дзейнасьці БС,—павінен зрабіць рашучы зрух па ўмацаваньні і палепшаньні ўсёй работы БС, зрабіўшы яго сапраўдным масавым органам РСІ у дапамогу партыі і ўраду па выкананьні ўсіх задач сацбудаўніцтва.

4. Для кіраўніцтва правядзеньнем 5-ці дзёньніка скласьці пры ЦКК-НК РСІ Бел. штаб пад старшынствам члена прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б тав. Зябкіна і прадстаўнікоў ЦСПСБ т. Пархоменка, ЦК ЛКСМБ т. Дубнікава, рэдакцыі газэты «Зьвязда»—т. Манькова, «Рабочы»—т. Кошкіна і «Савецкая Беларусь»—тав. Гірко, па-заштатных інспэктараў т.т. Пінскі, Сахно, Кузьменка, «Чырвоная Зьмена» т. Шмуклер і ад аб'яднаньня Б.С. тав. Кучароў ад ГарКК т. Куліненка—Менск.

5. Даручыць гар. і рай. КК РСІ стварыць такія-жа раённыя штабы пад кіраўніцтвам члена прэзыдыуму КК і прадстаўнікоў ад райпрафсавета, РК КСМ, раённай газэты і актыву РСІ.

6. Прапанаваць цэнтральнаму і раённым штабам на працяму 5-ці дзён распрацаваць канкрэтныя пляны сваёй апэрацыйнай работы, прадугледзіўшы ў іх пастаноўку на працяму падрыхтоўчага пэрыяду і ў часе 5-ці дзёньніка даклад аб рабоце БС на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, МТС, уцягваючы і замацоўваючы новы актыў РСІ; уцягнуць у працу па правядзеньні 5-дзёньніка цэнтральны, раённы і низавы друк і рабселькораў, арганізаваць паміж раённымі БС, групамі садзейнічаньня, пастамі БС, сэкцыямі РСІ, атрадамі «ЛК» і асобнымі добраахвотнікамі і актывістамі РСІ сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшую пастаноўку масавай работы.

Агляд работы Б.С. цесна ўвязаць з працай па актыўным удзеле ўсяго актыву РСІ да падрыхтоўкі і правядзеньня пасеўкампаніі.

7. У сувязі з праводзімымі зараз аб'яднан. Б.С. і раённымі БС справаздачна-перавыбарчай кампаніяй рабочых заседацеляў—гэту работу праводзіць неразрыўна з 5-ці дзёньнікам работы БС.

8. 5-дзёньнік БС павінен быць справай ня толькі органаў КК-РСІ, а падрыхтоўка і правядзеньне яго павінны прыцягнуць да сябе сур'ёзную ўвагу і аказаньне дапамогі з боку раённых камітэтаў партыі, партколектываў, парт'ячэек і праф. і грамадзкіх арганізацый.

9. Ускласьці пэрсанальную адказнасьць на старшынь гар. і рай. КК-РСІ і загадчыкаў БС, за своечасовую падрыхтоўку і правядзеньне самога 5-дзёньніка па рабоце Б. С., сыстэматычна заслухоўваючы на прэзыдыуме інфармацыю штаба.

10. Прасіць рэдакцыі газэт: «Зьвязда», «Рабочы», «Чырвоная Зьмена», «Савецкая Беларусь», «Рабселькор» і «Калгасьнік Беларусі» арганізаваць шырокае асьвятленьне ў друку падрыхтоўкі і правядзеньня 5-дзёньніка.

Старшыня ЦКК КП(б)Б Калінін.

Ударнікі барацьбы за лёнпрэміраваны

МАГІЛЕЎ. Дзякуючы бальшавіцкай барацьбе шляхам разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, брыгадная арганізацыі работы і ўвядзеньню зьдзельшчыны калгас «Іскра сацыялізму» (Гаранскага сельсавету) своечасова закончыў апрацоўку і здачу (продаж) лёнавалакна.

Замест 21,06 цит., паводле пляну, калгас здаў 22,65 цит. валакна, што складае **107,5 проц.** Лён апрацаваны добра, здадзенае валакно—8 га, 10 га 12 га пушгароў.

За ўдарную работу па выкананьні пляну лёнзагатовак старшыня праўленьня калгасу «Іскра сацыялізму» тав. Чудзінаў Андрэй прэміраваны грашыма ў суме 150 руб., а пазівод т. Чарнецкі Якуб—100 руб.

Д. Адан і Я. Глушынскі.

У парадку абмену вопытам

Арганізацыя і зьмест работы ў школьных майстэрнях і на вытворчасьці

Палітэхнічнае выхаваньне зьяўляецца адным з асноўных задач нашай савецкай школы. Яно з тэарэтычнай праблемы ўсім создамі сацыялістычнага будаўніцтва пастаўлена жыцьцём на практычныя рэйкі і ў сучасны момант зьяўляецца актуальнейшай выхаваўчай і гаспадарча-палітычнай задачай. У сувязі з задачай засваеньня вучнямі «асноў навук» палітэхнічная адука дзя займае цэнтральнае месца ва ўсім комплексе камуністычнага выхаваньня. Палітэхнічная адукацыя патрабуе і сталай палітэхнічнай асьветы для ўсёй работы школы і ў першую чаргу вытворча - палітэхнічнага абсталяваньня і цесная сувязі з вытворчасьцю.

Правільна падабранае палітэхнічнае абсталяваньне рабочага пакою, майстэрань і лябараторый—важнейшая умова правільнай арганізацыі палітэхнічнага навучаньня. Рабочы пакой, майстэрня і т. д. павінны будавацца на аснове чоткіх прынцыпаў, якія вызначаюцца самай сутнасьцю палітэхнізму.

У практыцы нашых школ мы да гэтага часу мелі дзьве майстэрні—сталярную і сьлясарную і амаль зусім не старалі іншых. Не адкідаючы вялікай ролі ў справе палітэхнізацыі сталярнай і сьлясарнай майстэрні, неабходна дабіцца арганізацыі ў майстэрняў камбінаваных, напрыклад: электратэхнічнай, электрамантажнай, такіх, дзе вучні маглі-б збудаваць тэлефонны зганок, электраматор і г. д.

Палітэхнічная школа павінна мець абсталяваньне ня толькі для мэханічнай апрацоўкі матар'ялаў, але і для хімічнай і аграбіялёгічнай (сельская гаспадарка), яна павінна даваць знаёмства з электратэхнікай і энэргэтыкай. Толькі пры гэтай умове школа будзе знаёміць дзяцей з апошнімі на зуковымі прынцыпамі вытворчасьці і даваць практычныя звычкі ў абращэньні з элемэнтарнейшымі інструмантамі ўсіх вытворчасьцяй.

Яшчэ да гэтага часу не адхілен недахоп нашых школьных майстэрань, які заключаецца ў тым, што паміж імі адсутнічае сувязь. Напрыклад, няма сувязі паміж сталярнай і сьлясарнай майстэрнямі. Праца ў тэй і другой ідзе самастойна. Зразумела, пры такім становішчы вучні не атрымоўваюць цэльнасьці вытворчага працэсу. Няма таксама сувязі паміж працай у майстэрнях і на вытворчасьці: там і тут праца ідзе адарвана, няма адзінага пляну ўвязкі працы вучняў у майстэрнях і на вытворчасьці. Праўда, у апошнія часы можна сустрэць школы, якія працу ў майстэрнях і на вытворчасьці будуюць па адзінаму пляну. На прыклад 20-ая ФЗС г. Менску, прыма цаваная да машынна-будаўнічага заводу імя Варашылава, атрымаўшы ад палітэхнічнага сэктару Навукова-Дасьледчага інстытуту камбінаваньня для праверкі праграму, склала плян работы, у якім імкнецца ўвязаць працу вучняў у майстэрні з працай на вытворчасьці. У той час, як ў майстэрні па мэтаду праходзіцца праграмны матар'ял па апрацоўцы металю, шчыльна зьвязаны з працай на вытворчасьці, ў майстэрні па дрэву вядуцца работы, якія зьвязаны з мадэльным і зборачным цэхамі. Зразумела, праца вучняў, як у майстэрні, так і на вытворчасьці павінна быць прадукцыйнай вучні робяць прамадзка-карысныя рэчы, апрацоўваючы дэталі, ці выробляючы іншыя вырабы, патрэбныя для школы, ці завода.

Важным момантам у рабоце майстэрань зьяўляецца арганізацыя працы. Сплош і радам у нашых школьных майстэрнях вытворчы працэс праходзіць неарганізавана. Інструктар не зварочае ўвагі на расстаноўку станкоў, на беспарадчае запрамадженьне майстэрні, між тым, як правільная расстаноўка станкоў і іншага абсталяваньня, інструмантаў і матар'ялаў мае вялізарнае значэньне для арганізацыі працы ў майстэрнях. Ня менш важнае значэньне ў справе арганізацыі працы і вытворчага навучаньня мае засваеньне вучнямі правіл як трэба працаваць, як разьмяркоўваць інструманты і матар'ялы ў працэсе работы. Неабходна з першых жа заняткаў вучняў уводзіць навукоую арганізацыю працы, каб дзеці зуміліся правільна працаваць, бо перавучваць іх потым будзе больш трудней.

Формы арганізацыі працы ў майстэрнях і на вытворчасьці павінны быць такія-ж, як і ў нашай рабоце. Працу ў майстэрнях і на вытворчасьці патрэбна будаваць па брыгаднаму прынцыпу, прычым неабходна утварыць неаслінія брыгады ў 3-4 чалавекі. Пры такім становішчы лягчэй праводзіць падзел працы, але трэба работу будаваць так, каб гэта брыгада аб хватвала ўвесь працэс у цэлым. Паміж брыгадамі вучняў і паміж брыгадамі вучняў і рабочых неабходна шырока разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва.

Вытворчае навучаньне павінна займаць адно з цэнтральных месц і таму падрыхтоўка і правядзеньне яго патрабуюць выключна сур'ёзнай ўвагі з боку школы. Патрэбна правільна арганізаваць вытворчае навучаньне вучняў на прадпрыемстве, ня згодзячы яго толькі да вузкай практыкі на прадпрыемстве, як гэта мела месца ў мінулыя гады.

20-ая ФЗС Менску, добра зразумела, што палітэхнізм не замыкаецца ў вузкія рамкі работы вучняў ў школьных майстэрнях, у правядзеньні кароткатэрміновай практыкі на прадпрыемстве. Школа дабілася ад завода вылучэньня інструктара з кваліфікаваных рабочых і арганізавала працу так, што вучні працу ў майстэрнях і на вытворчасьці чарпуюць у залежнасьці ад запатрабаваньняў праграмы. Напрыклад, калі перад 7-ай групай стаіць задача вывучыць токарны ці строгальны станок, вытворчая працы вучняў у школьных майстэрнях і на прадпрыемстве ад вучэбнай работы школы. Кожны выкладчык, добра і дэталёва вывучыўшы вытворчасьць, працу майстэрняў, рабочыя месцы на прадпрыемстве, матар'ял і інструманты, складае пляны сваёй працы, куды ўключае элемэнты, якія можна прайсьці ў працэсе работы на прадпрыемстве і ў майстэрнях. Напрыклад, выкладчык фізыкі ўключае ў свой рабочы плян мэханізмы для перадачы руху ад рухавіка да станкоў, якія канкрэтна вывучаюць вучні на вытворчасьці ў працэсе працы ў таго ці іншага станка. Выкладчык матэматыкі будуе сваю вучэбную работу, улічваючы лічбовы матар'ял выкананьня пяцігодкі прадпрыемства, зьяўляючы сябекошту на аснове розных тэхн

Выкарыстаць вопыт перадавых

Да канца кварталу навярстаць упушчанае

Раёны: Расонскі, Старадароскі, Уваравіцкі, Лельчыцкі, Асьвейскі, Лоеўскі, Пухавіцкі, Бялыніцкі, Капыльскі, Бярэзінскі, Койданаўскі, Жлобінскі, Шклоўскі, Талочынскі і Веткаўскі зрываюць выкананьне агульна-рэспубліканскага пляну мабілізацыі сродкаў. Неадкладна ліквідаваць прарыў. Поўнасьцю выканаць плян 1-га кварталу.

Адстаючыя, раўняйцеся па перадавых гарадох і раёнах!

Па становішчы на 10 сакавіка выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў на паасобных раёнах характарызуецца наступнымі лічбамі:

Ідуць уперадзе па выкананьні пляну на мабілізацыі сродкаў: Тураўскі раён—105,4 проц., Гомель—100,5 проц., Менск—80,7 проц., Мазыр—78,7 проц., Мсьціслаў—77,9 проц., Віцебск—76,3 проц., Заслаўль—74,8 проц.

Набіраюць тэмпы: Дубровенскі раён—73,5 проц., Быхаўскі—70,7 проц., Сеньненскі—69,2 проц.

За апошнюю дэкаду паслабілі тэмпы: Сіроцінскі раён, які даў за дэкаду 4,9 проц., Старобінскі—3,4 проц.

Ход выкананьня пляну мабілізацыі сродкам не забясьпечвае поўнага выкананьня пляну па Бабруйскаму раёну—63,1 проц., Магілеўскаму—62 проц., Аршанскаму—59,2 проц.

Зрываюць выкананьне пляну: Расонскі раён—34,1 проц., Старадароскі—36,2 проц., Уваравіцкі—36,6 пр., Лельчыцкі—38,2 проц., Асьвейскі—38,5 проц., Лоеўскі—42 проц.,—Бялынецкі—43,4 проц., Копыльскі—43,6 проц., Бярэзінскі—43,6 проц., Койданаўскі—44,1 проц., Жлобінскі 44,8 проц., Шклоўскі—45,9 проц.

Да канца кварталу засталося зусім мала часу. Гэты час павінен быць скарыстаны для штурму барацьбы за поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Асабліва трэба зьвярнуць за раз увагу на рапаючыя вучасткі мабілізацыі сродкаў (як культзбор, уклады ў ашчаджасы).

Да зрыўшчыкаў выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў павінны быць ужыты самыя жорсткія меры.

БССР абавязана цалкам і поўнасьцю выканаць плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу. Гэтага мы і павінны дамагчыся.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў пляну мабілізацыі сродкаў

Талачынскі раён увесь час зрывае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Плян 1-га кварталу на 10 сакавіка выкананы на 51,4 проц.

Раённы фінансавы аддзел, на чале якога стаіць т. **Пастарнак**, не забясьпечыў своечасовага правядзеньня арганізацыйна - падрыхтоўчай работы па культзбору, з прычыны чаго паведамленьні даручаліся да 11 сакавіка, замест 1-га лютага. На 1 сакавіка паступіла ўсяго 4 проц. наліччаных сум культзбору, тады як павінна было паступіць ня менш 50 проц. яшчэ да 15 лютага.

Пры правядзеньні сельгаспадатку і культзбору былі дапушчаны скрыўленьні клясавай лініі. Напрыклад, адназасобным гаспадаркам культзбор на лічаўся ў многіх выпадках ніжэй, чым калгасьнікам. Набіраюцца таксама «левацкія» загибы ў адносінах серадняка ў сэнсе перазабкладаньня сельгаспадаткам па кан'юнктурных даходах.

Да апошняга часу не ліквідавана за пазычанасьць кулацкіх гаспадарак па сельгаспадатку (на 10 сакавіка паступіла 77,8 проц., і страхоўцы (22 процанты). Зусім нічога не спагнана з кулацкіх гаспадарак па культзбору, хоць тэрмін ужо даўно прайшоў.

З прычыны адсутнасьці масавай работы і фінансавага актыву, у раёне ёсьць значны недабор па дабраахвотных плацяжох. Ашчаджаса дае сьтэматычны адлік па ўкладах. Райза і райкалгасаюз, а таксама МТС — сарвалі работу па рэалізацыі акцый. Трактарацэнтру. Райспажыўсаюз бязьдзейнічае ў галіне мабілізацыі сродкаў па паснакапленьні.

Райпрафсавет, райком ЛКСМБ, райкамсод і штаб фінпаходу, на чале якога стаіць т. **Козель** — літаральна бязьдзейнічаюць. Райкамсоду пры райкалгасаюзе зусім няма.

Усё гэта праходзіла міма раённай газэты **«Калгасьнік Талачынчыны»**, якая за люты месяц — не зьмясьціла ніводнага радка аб ходзе мабілізацыі сродкаў.

РК КП(б)Б, РВК і РКК РСІ адносіліся фармальна да справы мабілізацыі сродкаў. Не ўстанавілі чоткага апэрацыйнага кіраўніцтва выкананьнем фінпляну. Пастановы РК КП(б)Б не дасылаліся выканаўцам па паўтара месяцы. РКК РСІ зусім не цікавілася гэтай справай. РВК, хаця і ставіць пытаньне па мабілізацыі сродкаў на сваіх паседжаньнях, але пастановы яго носяць агульны характар. 23-га студзеня РВК была вылучана Камісія для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу аб мабілізацыі сродкаў; гэтая рэзалюцыя была складзена толькі 27-га лютага. Другі факт — на 1-га лютага былі выкліканы на паседжаньне РВК з дакладамі 5 старшынь сельсаветаў і калі выкліканыя старшыні зьявіліся, РВК пастанавіў: **«даручыць загадчыку райфа тав. ПАСТАРНАКУ пэрсанальна заслухаць даклады аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў па гэтых сельсаветах».**

Вось як махровыя апартуністы адносяцца да мабілізацыі сродкаў.

У зьвязку з пастановай СНК БССР аб прыцягненьні да жорсткай адказнасьці вінаватых у зрыве пляну мабілізацыі сродкаў па Талачынскім раёне — **матар'ялы перадаюцца Пракуратуры БССР.**

Калегія НКФ БССР — зьняла з пасады загадчыка райашчадкасы КАВАЛЕНКА з перадачай справы аб ім у ЦКК. Але гэтым абмяжоўваецца нельга. Трэба шырока разгнуць масавую работу па гэтай галіне.

Урокі Талачынчыны павінны быць улічаны ўсімі адстаючымі раёнамі.

Аляксандраў.

Скарыстаць вопыт барацьбы Заслаўшчыны

Заслаўскі раён, перавыканаўшы плян мабілізацыі сродкаў у IV квартале 3-га рашаючага году, і ў 1-м квартале не здае тэмпаў. Плян па 10 сакавіка выкананы на 74,8 проц.

Гэтых посьпехаў Заслаўшчына дабілася, дзякуючы шырока разгорнутай масавай работы і мабілізацыі на выкананьне пляну савецкай грамадзкасьці.

Для папулярызацыі фінансавых мерапрыемстваў праводзяцца сходы па калгасах і населішчах.

Скарыстоўваюцца меры грамадзкага ўзьдзейнічаньня і пашырэньня. Перадавыя сельсаветы і арганізацыі заносяцца на чырвоную дошку, зрываючыя плян—на чорную. Устаноўлены чырвоны і рагожны пераходныя сьцягі. Уведзены рагожныя пераходныя партфалі, якія выдаюцца парсанально старшыням сельсаветаў ці кіраўні кам арганізацый, што зрываюць выкананьне фінпляну.

Вядзецца сьтэматычная работа па стварэньні фінансавага актыву з калгасьнікаў. Лепшыя ўдарнікі высоўваюцца на сталую фінансавую работу. Правядзеньне фінансавага паходу распачата з раённага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту. Навсобныя ўдарнікі—праміруюцца. Уведзена чырвоная кніга для ўдарнікаў фінфронту—настаўнікаў. З ударнікамі трымаецца шчыльная сувязь праз упаўнаважаных.

Раённая газэта сьтэматычна асьвятляе ход выкананьня пляну, паўтлярызуючы вопыт лепшай масавай работы і мабілізацыі на выкананьне пляну савецкай грамадзкасьці.

РК КП(б)Б зьвярнуў вялікую ўвагу на актывізацыю работы камсамола па фінпляну. Да апошняга часу камсамольскія арганізацыі ў гэтай рабоце прымалі зусім недастатковы ўдзел.

Раён мае і на сённяшні дзень яшчэ некаторыя недахопы—гэта зусім недастатковы ўдзел райпрафсавету ў рабоце па мабілізацыі сродкаў. Стаіць у баку ад выкананьня пляну і райкалгасаюз. З прычыны гэтага на глядаецца адставаньне па некаторых вучастках пляну, напрыклад, па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (квартальнае заданьне на 10-е сакавіка выкананае толькі на 46,8 проц.). Гэтыя недахопы павінны быць выпраўлены.

Вопыт работы Заслаўшчыны неабходна скарыстаць усім раёнам. **М.**

Веткаўскі зрывае мабілізацыю сродкаў

Загадчык райфа атрым ў рагожны партфэль

На апошнім паседжаньні ўсебеларускага штабу фінпаходу былі заслуханы інфармацыі Заслаўскага, Уваравіцкага і Веткаўскага раёнаў аб разгорваньні фінпаходу і выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

Штаб адзначыў, што ў Заслаўскім раёне праведзена вялікая масавая работа, якая выявілася ў стварэньні чорнай і чырвонай дошкі, ва ўручэньні пераходных рагожных сьцягаў і партфэляў зрыўшчыкам фінпляну, ў арганізацыі чырвонай і чорнай кнігі для запісу выкананьня заданьняў настаўнікамі, у скліканьні канфэрэнцый ударнікаў фінфронту і г. д.

Разам з гэтым штаб адзначыў, што ва Уваравіцкім раёне з прычыны адсутнасьці масавай работы зрываецца выкананьне фінпляну з кварталу ў квартал. Штабам намечны рад мерапрыемстваў і прапанавана загадчыку Уваравіцкага райфа прыняць тэрміновыя захады для ліквідацыі прарыву.

Асабліва ганебна ў выкананьні фінпляну адстае Веткаўскі раён. Загадчык райфа тав. Стальмашонак ня толькі не забясьпечыў разгорваньне масавай работы, але нават сваёй бязьдзейнасьцю сьцытэматычна зрываў плян мабілізацыі сродкаў.

За апартуністычную бязьдзейнасьць у мабілізацыі сродкаў, рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» на гэтым-жа паседжаньні ўручана загадчыку Веткаўскага райфа пэрсанальна тав. Стальмашонку рагожны партфэль.

Веткаўскія раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны мабілізаваць усю грамадзкасьць на выкананьне заданьняў партыі і ўраду.

П.

Сацыялістычнай жывёлагадоўлі-

добраякаснае, таннае памяшканьне

Асноўны ўпор—на мабілізацыю мясцовых будаўнічых матар'ялаў

Фарсаваньне разьвіцьця буйнай сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур ставіць адказныя задачы ў галіне выкананьня будаўнічай праграмы калгасаў, асабліва ў справе забесьпячэньня сацыялістычнага статку памяшканьнямі.

Плян будаўніцтва на 1932 г. у калгасным сэктары вызначаны ў разьмеры ў 63 мільёнаў руб. (сумесна з прыстасаваньнем), супроць 30 мільёнаў руб. у 1931 г. Ня гледзячы на такі салідны плян будаўніцтва дэфіцытных будматар'ялаў калгасная сыстэма атрымае сёлета менш, чым у 1931 годзе. Няма ніякай патрэбы завозіць такія будаўнічыя матар'ялы, якія можна набыць на месцы. Плян будаўніцтва можна і трэба выканаць за кошт мясцовых рэсурсаў. Да гэтых мясцовых рэсурсаў адносяцца: лес (у тым ліку і лес абагуленых будынкаў калгасьнікаў, які павінен быць скарыстаны на 60—70 проц., як будматар'ял), цэгла, вапна, гонта, дранца, салома, гальлё, пясок, камень. Гэта асноўныя будматар'ялы, з якіх праводзіцца і па вінна праводзіцца будаўніцтва ўсіх аб'ектаў для калгасна - сацыялістычнага сэктару.

Ці ёсьць гэтыя матар'ялы на мясцох? Так, яны ёсьць. Пытаньне толькі ў тым, каб арганізаваць, наладзіць мабілізацыю гэтых матар'ялаў на месцох.

СНК БССР даў яскравую ўстаноўку і паставіў перад будаўнічымі арганізацыямі і калгасным сыстэмай у 1932 годзе наступныя задачы: 30 проц. аб'ектаў прыстасаваць. 40 проц. будаваць з новага віду мясцовых матар'ялаў (глінабітныя, гліна-гальлёвыя, гліна - плятнёвыя і г. д.) і толькі 30 проц. можна пабудаваць з новага дзерава.

Для выкананьня гэтай праграмы павінны быць шырока выкарыстаны мясцовыя матар'ялы на пакрыцьцё дахаў. Спасьлаўленне на адсутнасьць цьвікоў і гонтаў трэба разглядаць як апартуністычнае супрацілёленьне. Для дахаў можна з посьпехам выкарыстаць салому, ня толькі куляваю, але і звычайную. Калі няма куляваю саломы, са звычайнай саломы можна плесьці маты, якія трэба мачыць у растворы гліны. Справа толькі ў тым, каб як належыць падрыхтавацца да будаўнічага сэзону.

Трэба максымальна скарыстаць санную дарогу, вывезьці будаўнічыя матар'ял, своечасова ўлічыць, падрыхтаваць і скарыстаць на будаўніцтва мясцовыя будматар'ялы. З другога боку трэба забясьпечыць правядзеньне будаўнічых работ, як гэтага патрабуе рашэньне СНК БССР кругла год праводзіць будаўніцтва бяз усякіх перапынкаў.

У сьвеце гэтых асноўных задач перад калгассаюзамі, будаўчасткамі, праўленьнямі калгасаў стаяць наступныя канкрэтныя задачы:

У максымальна кароткі час скончыць вываазку леса, усіх мясцовых матар'ялаў (пясок, камень, вапна, гальлё, салома і г. д.) да вызначаных пунктаў будаўніцтва і пачаць ужо канкрэтна рэалізоўваць плян будаўніцтва 1932 г.;

пачаць работу па арганізацыі і ўзмацненьні калгасных і міжкалгасных будаўнічых сталых брыгад.

Неабходна вызначыць календарныя тэрміны скончэньня кожнага аб'екту будаўніцтва з такім разьлікам, каб 60 проц. усіх работ было скончана да 1 ліпеня г. г., а астатнія 40 проц. да 1 верасьня.

З самага пачатку трэба дабіцца рашучага пералому ў галіне пераводу падрыхтоўкі да будаўніцтва і самога будаўніцтва на баявыя ўдарныя тэмпы, шляхам шырокага разгортваньня мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва, на падставе 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на якасьць будаўніцтва, на падрыхтоўку добраякасных будматар'ялаў, падвышэньне кваліфікацыі калгасьнікаў - будаўнікоў, шляхам арганізацыі школ - брыгад і г. д.

Пры правядзеньні будаўнічых работ павінна быць поўнасьцю ліквідавана абязьлічка, усе работы трэба перавесьці на зьдзельшчыну. Разгортваючы падрыхтоўку да будаўнічага сэзону трэба таксама дабіцца зьніжэньня сабекошту будаўніцтва, скарочаньня арганізацыйна - гаспадарчых выдаткаў, ажыцьцяўляць рацыянальнае скарыстаньне матар'ялаў.

Без правядзеньня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё нямысьлімa пасьпяховае выкананьне пляну будаўніцтва. Даючы бязьлітасны адпор апартуністам усіх масьцей і адценьняў, шырока мабілізуючы калгасныя масы і выкарыстоўваючы мясцовыя будаўнічыя рэсурсы і сыравіну, праводзячы ўсе работы на падставе 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, мы дабіемся выкананьня і перавыкананьня пляну будаўніцтва 1932 году.

Сацыялістычная жывёлагадоўля павінна быць забясьпечана сьветлымі, таннымі і цёплымі памяшканьнямі.

Лабанаў.

Унутраныя рэсурсы не скарыстоўваюцца

Высунутая партыяй і ўрадам перад Белбудкалгасцэнтрам задача аб выкарыстаньні мясцовых матар'ялаў пры правядзеньні будаўніцтва ў калгасах, вымагае своечасовай і належнай падрыхтоўкі для рэалізацыі ўнутраных рэсурсаў.

У нас ёсьць залежы добраякаснай гліны, крэйды і вапны, якія з посьпехам могуць быць скарыстаны на будаўнічыя патрэбы. Нажаль, пераважная большасьць раёнаў гэтага не ўсьвядоміла як сьлед, ня ўсюды вызначаныя месцы будаўніцтва цагельняў і вапельняў. Талачыскі райкалгасбуд вучастак заяўляе, што яму «пакуль што вапельня непатрэбна», ня гледзячы на тое, што ў раёне ёсьць залежы вапны, бо, бачыце, вапну ён можа атрымаць з Крупскага раёну, а што датычыцца перавозкі, дык гэта «глупства», між тым, перавозка вапны будзе каштаваць даражэй чым яе выраб.

ПА ВАДЗЕ ХОДЗІЦЬ І ВАДЫ ПРОСІЦЬ.

Некаторыя раёны спадзяюцца выключна на заводы саматужнай капэрацыі. Гэтую надзею трэба разьбіць. Усім раёнам трэба зараз-жа вызначыць пункты, дзе будзе праводзіцца будаўніцтва вапельняў і заводаў, трэба замацаваць за гэтымі будаўніцтвамі рабочую сілу, забясьпечыць патрэбнымі матар'ялам і апаратам.

Перад намі стаіць задача забясьпечыць ня толькі сябе цэглай і вапнай, але лішкі яе здаць дзяржаве. Паводле пастановы калегіі НКЗБ, ў калгасах неабходна пабудаваць 64 новых цагельні з агульнай гадавой вытворчасьцю ў 9 млн. 600.000 шт. цаглін, 106 існуючых заводаў павінны выпусьціць 18 млн. 550.000 шт. цаглін, 12 існуючых і 17 новых будуемых вапельняў павінны выпусьціць 2.310 тон вапны для мэтаў будаўніцтва. Гэта вялікая праграма вымагае ад будаўнічых вучасткаў своечасова пачаць падрыхтоўку да будаўніцтва заводу, каб забясьпечыць плян будаўніцтва патрэбнай колькасьцю цэглы і вапны.

Акрамя памянутага віду будаўніцтва сёлета намечана правесьці значную праграму па пабудове розных іншых памяшканьняў, як кароўнікаў, сьвінарнікаў і г. д. Паводле вызначанага пляну, 40 проц. пляну павінны быць пабудаваны з глінагальлёвымі і глінаплеценымі сьценамі і 40 проц. з глінасаламянымі дахамі. Гэта вымагае шырокага ўжываньня гліны. Некаторыя раёны недаацэньваюць тэтай справы і імкнуцца скарацінь будаўнічую праграму з мясцовых матар'ялаў. Гэтым спробам трэба даць рашучы адпор.

Адначасова неабходна разгарнуць выраб ганчарнай чарапіцы, не чакаючы на цэмантавую, што дасьць таннымі, агнетрывалы, доўгавечны матар'ял. Побач з гэтым неабходна разгарнуць работу па вырабу камышыту, саламіту, сыравіна для якіх у нас ёсьць у радзе раёнаў (Глускі раён і інш.). Каб скараціць патрэбу ў цьвіках нам трэба будзе паставіць выпрацоўку дранцы фінскай стружкі, гонтаў, але асноўны ўпор павінен быць зьвернуты на выпрацоўку агнетрывалых матар'ялаў і бездэфіцытных будаўнічых матар'ялаў.

Адзначаныя вышэй прарывы ў справе мабілізацыі мясцовых будаўнічых матар'ялаў і падрыхтоўкі да пуску заводу па вырабу цэглы, вапны, чарапіцы і інш., павінны быць ліквідаваны на хаду. У аснову выкананьня пляну трэба пакласьці дагаворныя абавязацельствы райкалгасбудвучастка ў калгасамі, трэба паскорыць тэмпы заключэньня дагавароў.

Ня менш важна справа — гэта тэхпрамфінпляны прадпрыемстваў. Апошнія павінны быць складзены на мясцох у бліжэйшыя дні.

Паклаўшы ў аснову адзначаныя вузлавыя пытаньні, праводзячы вызначныя мерапрыемствы на падставе 6 умоў тав. Сталіна райкалгасбудвучастк і павінны дабіцца 100 проц. выкананьня пляну будаўніцтва 1932 г.

М. Плебанаў.

Падрыхтоўку да будаўніцтва—на ўдарныя рэйкі

Значны аб'ём будаўніцтва ў калгасах на 1932 г. патрабуе своечасовай і поўнай падрыхтоўкі будматар'ялаў.

Уся ўвага пры падрыхтоўцы да будаўніцтва павінна быць зьвернута на максымальнае скарыстаньне мясцовых і больш танных матар'ялаў, каб дабіцца як зьніжэньня кошту, так і своечасовага скончэньня аб'ектаў.

Ня гледзячы на тое, што праз некалькі дзнаў пачнецца будаўнічы сэзон, рад раёнаў вельмі марудна рыхтуецца да будаўніцтва, вывазка лесу не праводзіцца, не выкарыстоўваецца для гэтай мэты сазная дарога.

Асьвейскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Брагінскі, Быхаўскі, Дрысенскі, Заслаўскі, Кармянскі, Лепельскі, Лоеўскі і Плешчаніцкі раёны ў выніку бязьдзейнасьці зрываюць лесазагатовкі. Да пачатку сакавіка па калгасах гэтых раёнаў не загатоўлена ніводнага палена.

У радзе іншых раёнаў з прычыны бязьдзейнасьці будаўнічых вучасткаў і ўпаўнаважаных спэцыяльных цэнтраў і слабай пастаноўкі масава-арганізацыйнай работы сярод калгасьнікаў лесазагатоўкі выкананы ў самых мізэрных разьмерах. Так, Аршанскі раён выканаў плян на 2,2 проц., Крычаўскі—3,3 проц., Пухавіцкі—2,9 проц., Петрыкаўскі—3,3 проц., Сеньненскі—1,7 проц., Полацкі—3,5 пр. і г. д.

Хутка надойдзе бездарож. Зараз трэба максымальна выкарыстаць усе магчымасьці для вывазу лесаматар'ялу. Вакол гэтай работы неабходна маабілізаваць калгасныя масы.

Е. Фэйгіна.

Будаўнічыя аб'екты не забясьпечаны матар'ялам

ТАЛАЧЫН. Па калгасах Старасельскага сельсавету злачынна зрываецца будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. У калгасе «1-га мая» ніяк ня могуць закончыць кароўнік, які гніе бяз даху.

Таксама нічога ня робіцца па падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону. Вывазка лесу праводзіцца марудна. Калі зараз ня будуць ужыты захады да ўзмацненьня тэмпаў загатовак і падвозцы мясцовых матар'ялаў да вызначаных пунктаў будаўніцтва, гэтыя работы прыдзецца адкласьці на час пляўных работ, што ўскладніць правядзеньне сельска-гаспадарчай кампаніі і запражае зрывам будаўнічай праграмы.

І. Р.

Вывезьці лес па саннай дарозе

У калгасе «Чырвоны Пуцілавец», Аболецкага сельсавету, Талачынскага раёну ўся работа праводзіцца на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, дзякуючы гэтаму калгас дамогся вялікіх посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні. Калгас поўнасьцю выканаў усе віды загатовак. Закончыў камплектаваньне стада, належна арганізаваны дагляд за жывёлай.

Зараз калгас ударна рыхтуецца да будаўнічага сэзону. Праводзіцца загатоўка лесаматар'ялу, кожны дзень у лес выяжджае па 15-20 падвод. Лесаматар'ял будзе вывезены па саннай дарозе. Праўленьне калгасу прымае захады каб да пачатку будаўнічага сэзону поўнасьцю загатовіць і вывезьці ўсе неабходныя будаўнічыя матар'ялы.

У. В.

Камітэт загатовак пры Савеце Працы і Абароны абвясьціў месячнік завяршэньня лёназагатовак

МАСКВА. 16-III. (ТАСС). У выніку дэмабілізацыйных настрояў у некаторых раёнах загатоўкі лёнавалакна за апошнія месяцы скараціліся.

Асабліва рэзкае зьніжэньне тэмпаў лёназагатовак дапушчана, між іншым, па Заходняй вобласьці, якая выканала гадавы плян да 10 сакавіка толькі на 77 проц., па Ніжагародзкім краі—59 проц., Ленінградзкай вобласьці—70-75 проц., Беларусі—65 проц.

Гадавы плян лёназагатовак па ўсім Саюзе на 10 сакавіка выкананы на 75 проц.

Камітэт загатовак пры СПА канстатуючы нездавальняючы ход загатовак, пастанавіў правесьці з 15 сакавіка па 15 красавіка ўдарны месячнік па загатоўцы лёну.

На працягу месячніка трэба арганізаваць суцэльную праверку выкананьня дагавароў па кантрактацыі здатчыкамі лёну, правесьці рашучую барацьбу з лявацкімі тэндэнцыямі паасобных лёнаводных гаспадарак, дабіцца выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі элемэнтамі.

Трактарацэнтру і Калгасцэнтру прапанавана неадкладна прыступіць да праверкі гатоўнасьці пунктаў першапачатковай апрацоўкі лёну і забясьпечыць іх рабочымі брыгадамі. Траста зімовага і веснавога расьцілу павінна быць апрацавана да пачатку сяўбы.

В. Вольскі, М. Модэль

„ШТУРМ“

(Бел. Дзярж. Яўр. Тэатр)

На працягу апошніх 2 год Беларускі дзяржаўны яўрэйскі тэатр ня даў ніводнай пастаноўкі з яўрэйскай пралетарскай драматургіі. Гэты свой недахоп тэатр імкнецца кампэнсаваць работай над творамі пралетарскай драматургіі з другіх моваў, да якой трэба аднесьці і пастаноўку п'есы малодога украінскага пралетарскага драматурга Карнейчука. Той факт, што «Штурм» прайшоў у Менску 20 разоў пры поўнай адсутні сьведчыць аб зацікаўленасьці гэтым паказам з боку рабочага гледача.

Асноўным замыслам п'есы і паказу зьяўляецца супастаўленьне Данбасу і капіталістычнай Нямеччыны. Два штурм мы павінны былі паўстаць, паводле думкі аўтара і пастаноўшчыка, перад вачыма гледача. З аднаго боку—штурм прарыву на фоне гераічнай барацьбы за вугаль ударнікаў усесаюзнай качагаркі—Данбасу. З другога боку—штурм буржуазнага ладу рабочай клясай Нямеччыны на фоне эканамічнага крызісу, на фоне разбурэньня капіталістычнай гаспадаркі. Неадсрэдным стымулам для гэтэга твору зьявілася наступная думка, знайшоўшая адлюстраваньне ў прамове сакратара ЦК КП(б)У т. Касіёра. **«Сваёю творчаю работай, будуючы сацыялізм, мы запалім падпявольныя масы ўсяго капіталістычнага сьвету да наступных боек за перамогу міжнародняй пралетарскай рэвалюцыі»**, таксама як і суцуننія гэтай думцы наступныя радкі з лісту гамбурскіх рабочых: **«Мы з пільнай увагай сочым за вашай вялікай работай, за выкананьнем пяцігодкі. Кожная ваша перамога яшчэ больш надасьць нам балёрасьці, кожны прарыў на вытворчым фронце—непакоіць нас. Мы пасылаем вам шчырае пажаданьне непахісна стаяць на варце вялікіх заваёў Кастрычніка».**

Тэма паказу для сучаснага моманту надзвычайна актуальная, цікавая, але і вельмі адказная. Выкуньўшы перад сабой такую складаную задачу, аўтар і пастаноўшчык павінны былі падайсьці да яе вырашэньня, кіруючыся—ленінскай тэорыяй адбіцьця сваіх пераўдкасьці—ускрыць сутнасьць зьявішчаў і гістарычныя тэндэнцыі гэтых зьявішчаў, разгарнуць барацьбу ідэй у іх канкрэтным клясавым выяўленьні, зрабіць цэнтральнай мэтай спэктаклю паказ жывых людзей—канкрэтных носьбітаў псыха-ідэалёгіі пэўных сацыяльных трупп—у іх барацьбе, у супярэчнасьцях, у процэсе іх станаўленьня.

Ці вырашылі станоўча пастаўленую перад сабой задачу драматург і пастаноўшчык? На гэтым спынімся пад рабязьней, прааналізаваўшы спачатку адзін з бакоў пастаўленай задачы—барацьбу за сацыялістычны Данбас. Тут перад аўтарам паўстаў надзвычай на вялікі, разнастайны і поўнакроўны матар'ял савецкай рэчаіснасьці. Цэлы ланцут складанейшых зьяў, зьвязаных з сацыялістычным наступленьнем. Перш за ўсё клясавая барацьба—глыбокія сацыяльныя канфлікты. Шалёнае супрацілёленьне клясавага зорага ў адказ на разгорнутую барацьбу за новы мэханізаваны Данбас. Складаныя працэсы перавыхаваньня маладых шахцёраў з асяродку калгасьнікаў, ня зжыўшых яшчэ спадчыны дробна-буржуазных звычак і прымхаў барацьбы супроць элемэнтаў кансэрватызму сярод старых рабочых. Твор чы энтузіязм ударнікаў—перадавых удзельнікаў гераічнай барацьбы за новы Данбас, за новыя сацыялістычныя мэтады працы, і яго дыялектычная ісупярэчнасьць—п'яніцы, прагульшчыкі, лаятуны.

Трэба адразу сказаць, што аўтар у асноўным ня здолеў як сьлед аўладаць гэтым багацьцем матар'ялам. Штурм зугальнага прарыву не знайшоў свайго вобразнага выяўленьня. На сцэне мы яго фактычна ня бачым. Аб ім у значнай частцы можна дазнацца толькі з размоў у габінеце кіраўніцтва шахтамі,—са сцэнкі, якая зьяўляецца, да рэчы, мала перакананальнай, дзякуючы надзвычайнай схэматычнасьці і прымітыўнасьці сваіх псэўда-патэтычных разважаньняў, а таксама хадульнасьці дзейных вобразаў.

Ня бачым мы і элемэнтаў мэханізаванага Данбасу. Штурм прарыву пад мяняецца аўтарам прыватнай дэталлю—сцэнай абвалу ў шахце, выкары станай, між іншым, для разгорнутага ня шэрагу псыхалёгічных эпэодаў. Да дадным бокам гэтай сцэнкі зьяўляецца толькі досыць моцнае ўскрыцьцё сацыяльнага твару клясавага ворага, які пранік у шахцёрскія шэрагі для разбурэньня напружанай работы па праходцы новых шахт.

Трэба адзначыць, што пастаноўшчык т. Норд здолеў у шэрагу выпадкаў перамагчы надзвычайны схэматызм і абстрактнасьць драматургічнага матар'ялу, на мяючага камплексьцый най цэльнасьці. Дзякуючы гэтаму, асобныя сцэны гучаць досыць перакананальна і сьведчаць аб правільным мэтадалёгічным падыходзе да вырашэньня, нават да стварэньня новых мастацкіх вобразаў, не прадугледжаных аўтарам. У гэтым сэнсе да заслугі пастаноўшчыка трэба аднесьці ўдалае стварэньне вобразу камсамолкі-ўдарніцы Нэты, таксама як і ўзмацненьне вобразу шахцёра Міколы, што значна спрыяла ліквідацыі абязьлічкі ў аўтарскім тэксьце п'есы.

Эпізод «Над шахтай» у 1-м акце вобразна выяўляе перад гледачом працоўны энтузіязм гарнякіх мас. У гэтай-жа сцэнцы пастаноўшчык здолеў дыялектычна ўсьвятліць супярэчнасьці барацьбы за вугаль, паказаўшы, як нарадзіне з ударніцтвам—законным зьявішчам гэтай барацьбы, існуе і ля тунстаз, рвацтва, прагулы.

Верна вырашана і сцэна «у шахце» (2 акт), дзе поруч з адданай работай старога шахцёра Міколы, накіраванай да перавыкананьня вытворчай задачы, клясавы вораг Мажо патаемна праводзіць шкодніцкую, падрыўную дзейнасьць, якая вядзе да разбурэньня шахты. Надзвычайна трапна выкары станы ў гэтым месцы канвэйер, які ізогул адыгрывае вялікую ролю ў мастацкім выяўленьні сацыяльнага сэнсу спэктакля.

У фінале п'есы дэманстрацыя чырвоных франтавікоў стварае, дзякуючы гэтаму канвэйеру, уражаньне масавасьці і магутнасьці.

Асноўным зрывам п'есы і паказу зьяўляецца мэханістычнасьць супастаўленьня Данбасу і Нямеччыны. Гэта супастаўленьне застаецца сцэнічна неабгрунтаваным. Паміж абедзьвума тэмамі паказу няма арганічнай сувязі. Здарэньні ў Нямеччыне адбываюцца нібы-та зусім незалежна ад здарэньняў у Данбасе ,што далкам супярэчыць цэнтральнай задачы твору—якаю, такім чынам, не знайшла свайго вобразнага вырашэньня ні ў п'есе, ні ў спэктаклі.

На Захадзе, на фоне эканамічнага крызісу і абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяй, мы бачым рост клясавай сьвядомасьці і рэвалюцыйнай актыўнасьці пралетарскіх мас. Ідзе падрыхтоўка да апошняга штурму цыта дэляй капіталізму. Але адначасова з гэтым назіраецца і ўзмацненьне фашызму, кансалідацыя сіл абаронцаў старога ладу.

Апошняе заставалося для аўтара і пастаноўшчыка незразумелым. Паказ кансалідацыі сіл фашызму ў выглядзе эксцэнтрычнага карнавалу факсстротных дам і лёгкадумных паненак, у выглядзе нейкай жаночай гульні ў салдацікі, зьяўляецца цалкам наверным і палітычна памылковым. Перад намі яўная недацэнка клясава супроцьлеглых пралетарыяту сіл на Захадзе, не гаворачы ўжо аб поўнай данёне фармалістычным шуканьням, выяўленай у гэтых сцэнах пастаноўшчыкам. Шэраг складанейшых зьяў заходняй рэчаіснасьці паданы ў паказе спрошча на і павярхоўна. Недастаткова разгорнута выяўленьне галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі—сацыял-фашызму. Фігуры сацыял-фашыстаў у паказе ня сур'ёзныя. Сацыял-дэмакрат Гопнэр трактуецца рэжысэрам у якасьці сьмешкай марыянэткі, у выглядзе камэдыйнай фігуркі, нагадваючай правіцыяльнага доктара, ці натарыуса. Гэта марыянэтка, па кожным загадзе фабрыканта Фрыкса, гатова—пад дырыжэрствам паліцэймэйстэра, у любым месцы рабіць свае прамовы аб клясавай згодзе.

Другі сацыял-дэмакрат, паказны ў выглядзе жуліка, прайдзісьвета, які дэманстратыўна дзьмгае «зароблены мі» здрадніцтвам прашыма.

Ясна, што такая спрошчаная, пераважна схоўная трактоўка ня можа адпавядаць сапраўднасьці, бо сацыял-фашызм на Захадзе зьяўляецца паводле пастановы апошняга пленуму ВККІ, найбольш небясьпечным і сур'ёзным ворагам рабочае клясы. Элемэнты прымітыўнага спрашчэньства адчуваюцца і ў «гандлёвай» сцэне паміж Фрыксам і пастарам, які дарэчы зроблен чамусьці ксяндзом.

Карыкатурны і маланатуральны вобраз паліцэймэйстэра. Цалкам незразумелай для гледача застаецца фігура інжынэра Альфрэда. Назошта ён выведзены ў п'есе? Што хацеў сказаць аўтар гэтым вобразам? Дзе прычыны рашчоўных рэвалюцыйных настрояў гэтага буржуазнага спэцыялістажаніха дачкі фабрыканта, сьвядомай фашысткі Эльзы? Чаму ён зьнікае з п'есы пасьля сваёй заявы аб тым, што едзе ў СССР? Чым выкліканэ гэта заява? Невядома. Спачатку ўзьнікае думка аб тым, што аўтар пакажа Альфрэ да ўдзельнікам штурму ў Данбасе і гэтым выкарыстае яго ў якасьці жыцёвага зьвяна паміж абодвумі бакамі тэмы, даказаўшы адначасова, што адзіным прыймальным месцам прыстасаваньня сваіх тэхнічных ведаў зьяўляецца для сумленнага спэцыяліста толькі СССР. Але гэтая думка ў далейшым ходзе паказу не знаходзіць сабе падтрыманьня. Альфрэд канчатково і беспаваротна зьнікае з п'есы гэтак-жа выпадкова і няўгр

УСЁ ШТО ХОЧАЦЕ, АПРОЧ АДМАЎЛЕНЬНЯ АД УЗБРАЕНЬНЯЎ

У Жэнэве сфабрыкавана яшчэ адна падкамісія: аб „маральным“ разбраеньні

„Душазбаўчая“ дыверсія Польшчы

ЖЭНЭВА. 15 САКАВІКА. (СПЭЦКОР. ТАСС). Сёньня адбылося пасяджаньне палітычнай камісіі канфэрэнцыі па разбраеньні. Гендэрсон спачатку паведаміў, што згодна выпрацаванаму парадку дня палітычнай камісіі першым падлягае абгаварэньню пытаньне аб «маральным разбраеньні», і даў з гэтаю мэтаю слова польскаму дэлегату Шумлякоўскаму. Трэба ўспомніць, што Польшча зьяўляецца ініцыятарам праекту так званага «маральнага разбраеньня».

Шумлякоўскі ў доўгай прамове давёў неабходнасьць «разбраеньня розумаў», спасылаючыся пры гэтым на складзены на тую-ж тэму польскі мэмарандум ад 17 верасьня 1931 г. Шумлякоўскі патрабаваў увядзеньня ўсімі дзяржавамі пакаранасьці заклікаў да вайны, агітацыі за парушэньне міжнароднага права і г. д. Затым ён патрабаваў скліканьня канфэрэнцыі прэсы для абгаварэньня мер да маральнага разбраеньня у «гармоніі з недатыкальнай свабодай друку, а роўна мер у справе выхаваньня будучых пакаленьняў». Шумлякоўскі патрабаваў таксама падрыхтоўкі згоды ў галіне дзейнасьці кіно, тэатру і г. д.

У заключэньне ён прапануе стварэньне падкамісіі, куды польскі ўрад і ўнясе свой праект канвэнцыі аб «маральным разбраеньні».

Грабавое маўчаньне

Прапанова Шумлякоўскага аб стварэньні падкамісіі выслухоўваецца на пасяджаньні палітычнай камісіі моўчкі. Ніхто не бярэ слова.

Гендэрсон прапануе пытаньне па сутнасьці не абгаворваць, а ўнесьці толькі рашэньне аб стварэньні падкамісіі. Ён распытвае членаў камісіі, ці згодны яны на стварэньне падкамісіі па «маральным разбраеньні».

Польская прапакова адцягвае ўвагу канфэрэнцыі ад яе непасрэдных задач

Я не магу,—заяўляе тав. Літвінаў,—ня ўспомніць пры гэтым аб ідэнтычных прапановах, зробленых у іншым месцы. Гэта было роўна 10 год назад. Калі генуэская канфэрэнцыя адхіліла прапанову савецкага ўраду аб разбраеньні, савецкі ўрад склікаў у Маскве канфэрэнцыю прадстаўнікоў непасрэдна заходніх суседзяў Савецкага Саюзу і прапанаваў ім частковае скарачэньне ў рэгіянальным маштабе.

Гэта прапанова была аднак адхілена, і ёй была процідастаўлена прапанова аб маральным разбраеньні.

Я вельмі непакоюся, як-бы мы ў канцы сваіх работ не апынуліся перад прапановамі ці канвэнцыяй, аб маральным разбраеньні, процідастаўленымі матар'яльнаму разбраеньню. У гэтым заключаецца небясьпека зробленых сёньня прапаноў, і супроць гэтай небясьпекі я лічу сваім доўгам перасьцерагчы палітычную камісію, а праз яе і канфэрэнцыю.

Я мяркую,—заключае т. Літвінаў,—што канфэрэнцыі ня трэба было-б, асабліва ў пачатку сваіх работ, адцягваць увагу ў бок пабочных задач, не завяршыўшы яшчэ ніводнага кроку па шляху ажыцьцяўленьня сваёй непасрэднай задачы, г. зн. матар'яльнага разбраеньня.

Калі аднак палітычная камісія вырашыць цяпер-жа стварыць падкамісію па маральным разбраеньні, дык я павінен заявіць, што савецкая дэлегацыя ня можа лічыць гэта ажыцьцяўленьнем якой-небудзь функцыі канфэрэнцыі па разбраеньні ці скарочаньні ўзбраеньняў, як-бы савецкая дэлегацыя ні адносілася спачувальна да прапаноў аб маральным разбраеньні па сутнасьці».

Заява тав. Літвінава заслухоўваецца з вялікай увагай дэлегацыямі, прэсай і публікай.

Яшчэ адна падкамісія

Гендэрсон запэўнівае тав. Літвінава, што «маральным разбраеньнем» ніхто, бачыце, ня зьбіраецца замяніць ці падмяніць матар'яльнае разбраеньне.

Таму што супроць стварэньня падкамісіі па маральным разбраеньні ніхто, апроч тав. Літвінава, больш ня выказваецца, палітычная камісія большасьцю галасоў, пры вялікай колькасьці ўстрымаўшыхся, прымае прапанову прэзыдыуму аб стварэньні падкамісіі ў складзе прадстаўнікоў 21 краіны, у тым ліку буйнейшых дзяржаў, уключаючы і СССР.

Выступленьне тав. Літвінава

Слова бярэ тав. Літвінаў, які заяўляе, што з прапановамі польскай дэлегацыі па-сутнасьці ці наўрад можна не згадзіцца.

На справе,—гаворыць тав. Літвінаў,—хто будзе абараняць падахвочваньне ваяўнічых настрояў, прапаганду ў карысьць парушэньня міжнародных законаў або распаўсюджваньне няправільных і скажоных чуткаў, або фальшывых дакумантаў?

Ніводная дзяржава так не цярпела і ня церпіць ад распаўсюджваньня няверных вестак, фальшывых дакумантаў і варожых паклёпніцкіх кампаній, як савецкі Саюз. Наўрад ці можна мець што-небудзь супроць прапаноў аб скліканьні канфэрэнцыі прадстаўнікоў друку.

Тав. Літвінаў напамінае, што падобная канфэрэнцыя сабралася нядаўна ў Капенгагене пры актыўным удзеле прадстаўніка Савецкага Саюзу і што намечана ўжо новае скліканьне такой канфэрэнцыі незалежна ад польскіх прапаноў.

Нельга таксама не спачуваць,—заяўляе тав. Літвінаў,—усялякім мерапрыемствам урадаў супроць злоўжываньняў радыёвяшчаньнем, кінематаграфіяй і сцэнай ў шавіністычных мэтах.

Тав. Літвінаў выказвае, аднак, сумненьне наконт неабходнасьці і мэтазгоднасьці заняцца гэтым цікавым пытаньнем на канфэрэнцыі па разбраеньні, асабліва ў сучасный стадыі, г. зн. у пачатку яе работ.

Ён ўпаўне разумее спакушальнасьць скарыстаньня сходу прадстаўнікоў усіх дзяржаў для абгаварэньня пытаньняў, якія маюць дачыненьне да міжнароднага жыцьця. Такіх пытаньняў можна знайсьці шмат. Неабходна, аднак, выбіраць такія пытаньні, якія-б былі зьвязаны непасрэдна з задачай канфэрэнцыі, г. зн. з разбраеньнем або скарачэньнем разбраеньняў.

Тав. Літвінаў заяўляе, што ён ня бачыць, каб у якой-небудзь меры нават максымальнае ажыцьцяўленьне польскіх прапаноў магло выканаць задачу канфэрэнцыі.

Як наконт арміі, флётаў, бамбавозаў і іншага?

Ніякае маральнае разбраеньне,—гаворыць т. Літвінаў,—немагчыма, калі яму ня будзе папярэджаць, ці яно ня будзе, прынамсі, справаджацца адмаўленьнем ад узбраеньняў.

Шавіністычныя і джынгаістычныя (ультраімпэрыялістычныя) настроі,—працягвае тав. Літвінаў,—не выцякаюць непасрэдна з пачуцьця ці інтарэсаў шырокіх мас насельніцтва.

Шавіністычныя настроі жывяцца наяўнасьцю розных супярэчнасьцей паміж дзяржавамі ці ствараюцца штучна прапагандай, уласным выхаваньнем, адпаведнай прэсай. Але робіцца ўсё гэта з пэўнай мэтай, з мэтай апраўданьня ўзбраеньняў і павялічэньня гэтых узбраеньняў, з мэтай апраўданьня войнаў. Робіцца ўсё гэта пэўнымі сацыяльнымі групамі, якія зацікаўлены ў ваеннай прамысловасьці, зацікаўлены ў выцягненьні прыбыткаў ад войнаў і часцей зацікаўлены ў адцягненьні ўвагі народаў ад сацыяльных патрэб і задач. Пакуль гэтыя групы захоўваюць свой сучасны ўплыў на грамадзкае жыцьцё і нават на ўрадавыя мерапрыемствы сваіх краін, ніякімі міжнароднымі канвэнцыямі ня ўдасца перашкодзіць ім у праследваньні іх мэтаў.

Пакуль захоўваюцца ўзбраеньні, пакуль захоўваецца магчымасьць войнаў паміж народамі, сацыяльныя групы, зацікаўленыя ў гэтым, будуць усяляк супраціўляцца і процідзейнічаць якім-бы то ні было мерам ка карысьць устанаўленьня сапраўднай дружбы паміж народамі.

З другога боку, зьнішчэньне армій, флётаў, ваеннай авіяцыі і зьнішчаньне ці зьмяншэньне магчымасьцяй ваны зьявяцца больш магутным сродкам прапаганды міжнародных пачуцьцяў, чымся любыя міжнародныя канвэнцыі ці законадаўчыя мерапрыемствы ўрадаў.

Гэтак званае маральнае разбраеньне ёсьць ні што іншае, як адваротны бок матар'яльнага разбраеньня. Калі разброімся матар'яльна, дык дабіёмся і маральнага разбраеньня. Маральнае-ж разбраеньне тымі шляхамі, якія нам прапануюць, ня цягне за сабой абавязковага матар'яльнага разбраеньня.

Неабходна згрупаваць усе намаганьні на матар'яльным разбраеньні, і толькі тады, калі гэтыя намаганьні будуць мець посьпех, прапаноўныя вы хаваўчыя сродкі змогуць аказацца сапраўднымі, калі ў іх наогул яшчэ застанецца патрэба. Прапановы, падобныя зробленым сёньня, могуць сьцягнуць канфэрэнцыю з яе дарогі.

У дні Парыскай камуны

Я хачу быць вольным—гэта мае права і я абараняюсь.—Адзін з плякатаў апошніх дзён камуны.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. арт. 12, 43, 44 і 45 палажэньня пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Дапоўніць арт. 12 палажэньня пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты (З. З. БССР 1931 г. № 15, паст. 134) абзацам другім у наступнай рэдакцыі:

«Члены раённага выканаўчага камітэту выключаюцца з яго складу па пастанове раённага выканаўчага камітэту ў выпадку:

а) скрыўленьня ў сваёй рабоце кляса вай пралетарскай палітыкі;

б) учыненьня ганьбуючага праступку, або злачынства;

в) пазбаўленьня выбарчых правоў;

г) выезду на сталае пражываньне за межы раёну».

2. Запісаць арт. арт. 43, 44 і 45 палажэньня пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты (З. З. БССР 1931 г. № 15, паст. 134) у наступнай рэдакцыі:

«43. Для беспасрэднага загадваньня на тэрыторыі раёну паасобнымі галінамі кіраўніцтва, што ўваходзяць у кампетэнцыю раённага выканаўчага камітэту, раённы выканаўчы камітэт мае наступныя аддзелы: 1) агульны, 2) зямельны, 3) фінансавы і 4) народнай асьветы, а таксама плянавую камісію і раённую рабоча - сялянскую інспэкцыю.

Апрача гэтага пры кожным раённым выканаўчым камітэце існуе раённае кіраўніцтва рабоча - сялянскай міліцыі, інструктары па савецкім будаўніцтве, камітэт па палепшаньні ўмоў працы і быту работніц і сялянак і раённыя інспэктары: 1) мясцовай гас падаркі, 2) дарожнага будаўніцтва, 3) спадчыньня, 4) аховы здароўя, 5) працы і сацыяльнага страхаваньня, 6) сацыяльнага забесьпячэньня, 7) вайсковых спраў і 8) фізічнай культуры.

44. З дазволу прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР у раёнах са значна разьвітай мясцовай прамысловасьцю і значнаю камунальнаю гаспадаркай могуць арганізоўвацца аддзелы мясцовай гаспадаркі, а ў раёнах, са значнаю сеткаю дарог — аддзелы дарожнай гаспадаркі.

45. Арганізацыя ў раёне органаў рабоча - сялянскай інспэкцыі, органаў рабоча - сялянскай міліцыі і судовых органаў устанаўляецца спэцыяльным законадаўствам пра іх СССР і БССР».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

ПАПРАЎКА:

У аб'яве аб ліквідацыі Грэскага райспажыўсаюзу („Савецкая Беларусь“ № 62 ад 18-III г. г.) надрукавана — ліквідацыйная камісія трэсту райспажыўсаюзу—трэба чытаць „ліквідацыйная камісія Грэскага райспажыўсаюзу.

Палажэньне

пра Народны камісарыят камунальнай гаспадаркі БССР

1. Народны Камісарыят камунальнай гаспадаркі БССР непасрэдна падпарадкоўваецца ЦВК БССР, яго Прэзыдыуму і СНК і ў сваёй дзейнасьці ажыцьцяўляе дырэктывы і задачы гэтых органаў, кіруючыся ў адпаведных выпадках пастановамі Усесаюзнага Савету па камунальнай гаспадарцы пры ЦВК Саюзу ССР.

2. Народны камісарыят камунальнай гаспадаркі плянуе, рэгулюе і кіруе камунальнай і жыльлёвай гаспадаркай і будаўніцтвам, сацыялістычнай рэканструкцыяй існуючых і пабудовай новых гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў і супроць-пажарнай аховай, вядзе нагляд і кантроль за дзейнасьцю падпарадкаваных яму плянуючых, навукова-тэхнічных і будаўнічых органаў і за дзейнасьцю абслугоўваючых камунальную гаспадарку прадпрыемстваў, а таксама ажыцьцяўляе тэхнічнае рэгуляваньне непрамысловага будаўніцтва (школ, больніц і г. д.).

3. У галіне плянаваньня на Народны камісарыят камунальнай гаспадаркі ўскладаецца:

а) распрацоўка зводных перспэктыўных плянаў і гадавых кантрольных лічбаў камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і будаўніцтва;

б) плянаваньне будаўніцтва новых і рэканструкцыі існуючых гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў;

в) складаньне плянаў патрэб камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і будаўніцтва ў будаўнічых матар'ялах і абсталяваньні;

г) нагляд за выкананьнем плянаў камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва;

д) складаньне плянаў задавальненьня патрэб камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і будаўніцтва кадрамі;

е) складаньне зводных плянаў фінансаваньня і крэдытаваньня камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі;

ж) складаньне плянаў пажарнай аховы і плянаў забясьпячэньня ўсіх пажарных арганізацый патрэбным абсталяваньнем;

4. У галіне плянаваньня і рэканструкцыі гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў на Народны Камісарыят камунальнай гаспадаркі ўскладзецца:

а) Зацьверджаньне асноўных правіл, норм і тыпавых праектаў плянаваньня і забудоўкі гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў, саўгасаў і калгасаў у адпаведнасьці з плянамі разьвіцьця прамысловасьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі;

б) арганізацыя геадэзычных службаў і работ па плянаваньні;

в) кіраваньне арганізацыямі, якія праводзяць праектаваньне і плянаваньне гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў;

г) зацьверджаньне праектаў і тэхніка-эканамічнае рэгуляваньне інжэнэрных пабудоў.

5. У галіне камунальнага, жыльлёвага і непрамысловага будаўніцтва на Народны Камісарыят камунальнай гаспадаркі ўскладаецца:

а) распрацоўка мерапрыемстваў па арганізацыі камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, кіраваньне органамі, якія ажыцьцяўляюць гэтае будаўніцтва;

б) распрацоўка норм і тыпавых праектаў і ўстанаўленьне правіл і лімітаў па камунальнаму будаўніцтву;

в) зацьверджаньне праектаў па камунальнаму, жыльлёваму і іншаму непрамысловага будаўніцтва па ўстаноўленым парадку;

г) тэхніка-эканамічнае рэгуляваньне камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, а таксама тэхнічнае рэгуляваньне непрамысловага будаўніцтва незалежна ад таго, кім будаўніцтва праводзіцца і фінансуецца;

д) распрацоўка мерапрыемстваў па пашырэньні будаўніцтва стандартных дамоў і іншых камунальных пабудоў;

е) арганізацыя і кіраваньне вопытным агітпрыбальным будаўніцтвам;

ж) распрацоўка мерапрыемстваў па рацыяналізацыі камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, па палепшаньні яго якасьці і патаньненьні кошту, па замене дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў меншдэфіцытнымі, па разьвіцьці выробу мясцовых будаўнічых матар'ялаў;

з) арганізацыя вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў і камунальнага абсталяваньня ў сыстэме органаў камунальнай гаспадаркі;

і) разьмеркаваньне фондаў будаўнічых матар'ялаў для патрэб камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і будаўніцтва і нагляд за іх адпаведным скарыстаньнем;

к) агульны кантроль за скарыстаньнем па прызначэньні сродкаў, вызначаных на камунальнае і жыльлёвае будаўніцтво;

л) агульнае рэгуляваньне прыватнага жыльлёвага будаўніцтва.

6. У галіне жыльлёвай гаспадаркі на Народны Камісарыят Камунальнай гаспадаркі ўскладаецца:

а) разьвіцьцё гарадзкой жыльлёвай гаспадаркі, у адпаведнасьці з плянамі прамысловага будаўніцтва, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, а таксама павялічэньнем гарадзкога насельніцтва і ростам бытавых і культурных патрэб шырокіх мас працоўных;

б) кіраваньне арганізацыяй, эксплёатацыяй усяго жыльлёвага фонду, а таксама рэгуляваньне эксплёатацыі гандлёва-складачных памяшканьняў;

в) распрацоўка сыстэмы пабудовы тарыфу і агульнае рэгуляваньне аплаты за карыстаньне жыльмі і нежылымі памяшканьнямі і будынкамі;

г) агульны нагляд за дзейнасьцю жыльлёвай кааперацыі і дапамога яе разьвіцьцю і ўзмацненьню;

д) кіраваньне арганізацыяй і правядзеньнем работ па інвэнтарызацыі жыльлёвай гаспадаркі;

е) агульны нагляд за скарыстаньнем прыватнаўласьніцкага жыльлёвага фонду.

7. У галіне камунальнай гаспадаркі і добрабыту на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) кіраваньне разьвіцьцём камунальнай гаспадаркі ў адпаведнасьці з плянамі індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі;

б) агульнае кіраваньне і распрацоўка норм і правіл па гаспадарча-тэхнічнай эксплёатацыі і будаўніцтву ўсіх галін камунальнай гаспадаркі;

в) распрацоўка мерапрыемстваў па электрыфікацыі, цёплафікацыі і газафікацыі гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў;

г) рэгуляваньне водазабясьпячэньня, каналізацыі і ачысткі населенных пунктаў;

д) распрацоўка мерапрыемстваў па разьвіцьці дарожнага і маставога будаўніцтва ў гарадох, рабочых пасёлках і раённых цэнтрах і па разьвіцьці гарадзкога і раённага камунальнага транспарту;

е) распрацоўка мерапрыемстваў па разгортваньні зелёных насаджэньняў у гарадох, рабочых пасёлках і раённых цэнтрах, мерапрыемстваў па ўпарадкаваньні садова-паркавай гаспадаркі, арганізацыі паркаў культуры і адпачынку.

ж) агульнае рэгуляваньне тарыфаў і норм па аплаце камунальных паслуг;

з) кіраваньне арганізацыяй і правядзеньнем работ па інвэнтарызацыі фондаў камунальнай гаспадаркі.

8. У галіне зямельнай гаспадаркі ў гарадох і паселішчах на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) правядзеньне мерапрыемстваў па забясьпячэньні гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў зямельнымі плошчамі і лясными масывамі;

б) кіраваньне правядзеньнем гаспадарчага ўпарадкаваньня зямель гарадзкіх, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў;

в) рэгуляваньне арэндной платы за карыстаньне зямельнымі вуачасткамі ў гарадох, рабочых пасёлках і раённых цэнтрах.

9. У галіне пажарнай аховы на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) кіраваньне, рэгуляваньне і кантроль пажарнай справы ў БССР;

б) кіраваньне дзейнасьцю камунальных, ведамасьвенных і дабравольных супроць-пажарных арганізацый (за выключэньнем супроць-пажарнай аховы НК ваенмора, чыгуначнага і водзнага транспарту і прамысловасьці), аб'яднаньне работы гэтых арганізацый, дапамога разьвіцьцю дабравольных пажарных арганізацый;

в) тэхнічная нормалізацыя, снабжэньне і нагляд за якасьцю вырабляемага і выпускаемага ў зварот пажарнага інвэнтару, абсталяваньня і прылад;

г) кіраваньне арганізацыяй і правядзеньне работ па інвэнтарызацыі супроць-пажарнага інвэнтару, абсталяваньня і інш.

10. У галіне арганізацыі працы і падрыхтоўкі кадраў на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) падрыхтоўка кадраў для патрэб камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі, будаўніцтва і супроць-пажарнай аховы і кіраваньне падрыхтоўкай гэтых кадраў мясцовымі органамі камунальнай гаспадаркі;

б) арганізацыя навучальных устаноў і курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў для камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і пажарнай аховы і кіраваньне імі;

в) вучот і разьмеркаваньне кіруючых кадраў камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі і пажарнай аховы;

г) правядзеньне мерапрыемстваў па арганізацыі працы ў камунальнай і жыльлёвай гаспадарцы і будаўніцтве і пажарнай аховы.

11. У галіне вучоту і статыстыкі на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) кіраваньне пастаноўкай вучоту і справаздачнасьці ў камунальнай і жыльлёвай гаспадарцы і пажарнай аховы;

б) зьбіраньне і распрацоўка даных пра становішча і разьвіцьцё гарадоў, рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў;

в) устанаўленьне мэтадалёгіі вучоту камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, яго каштоўнасьці і будаўнічага бюджэту;

г) складаньне балянсаў камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі;

д) распрацоўка мерапрыемстваў па рацыяналізацыі вучоту па ўсіх галінах камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі;

е) вучот насельных пунктаў БССР, зьбіраньне сыстэматызацыя і распрацоўка даных аб становішчы і разьвіцьці гарадоў, рабочых і дачных пасёлкаў, мястэчак.

12. У галіне кіраваньня на Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі ўскладаецца:

а) праводзіць сваю работу на падставе шырокага прыцягненьня да ўдзелу ў кіраваньні камунальнай гаспадаркай і кантролю за дзейнасьцю камунальных органаў, сакцый саветаў і выкашкомаў і грамадзкіх арганізацый;

б) укараненьне гаспадарчага разрахунку ў камунальную б, жыльлёвую гаспадарку і будаўніцтва;

в) дапамога органам спэцыялізацыі, рацыяналізацыі і рабочаму выналіцтву ў галіне камунальнай і жыльлёвай гаспадаркі;

г) зацьверджаньне стаўкаў камунальных і жыльлёвых абыгрананьняў, прэмтаў і будаўнічых арганізацый і ты пазых стаўкаў дабравольных пажарных арганізацый, а таксама ўстаноў і арганізацый, якія арганізуюцца пры НККГ;

д) выпрацоўка спраў пра нацыяналізацыю і муніцыпалізацыю будынкаў;

е) выданьне ў межах сваёй кампетэнцыі інструкцый, пастаноў і правілаў.

13. На чале Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі стаіць Народны Камісар Камунальнай Гаспадаркі.

14. Структура Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі ўстанаўляецца НККГ па ўзгадненьні з НК Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі.

15. Пры Народным Камісарыяце Камунальнай Гаспадаркі могуць існаваць на падставе гаспадарчага разрахунку абъяднаньні па камунальнаму і жыльлёваму будаўніцтву, па плянаваньні гарадоў, снабжэньні камунальнай гаспадаркі і г. д.

Старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў.

Старшыня СНК БССР М. Гаўдзед.

Сакратар ЦВК БССР
М. Гнілякевіч.

26 лютага 1932 г.
г. Менск.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Бюро парткалектыву, ФЗК і заводакіраўніцтва друкарні імя Сталіна выносяць сваё спачуваньне

Тав. КАЖДАНУ І.

з прычыны сьмерці яго дачкі **30і**

VII зьезд кампартыі Францыі

ПАРЫЖ, 15-III. У шырока разгарнуўшыхся спрэчках па дакладах т. т. Торэза і Дзюкло, дэлегаты аднадушна салідарызуюцца і адзначаюць рад дасягненьняў мясцовых партыйных арганізацый, як вынік правядзеньня імі лініі ЦК. Дэлегаты падкрэсьліваюць адначасова недахопы ў партрабоце.

Дэлегат ЛІЁНСКАГА раёну падкрэсьлівае слабасьць антываеннай работы ў гэтым раёне, дзе знаходзяцца ваенныя заводы Крэзо, Бэрліо і інш. Прамоўца ганьбіць далей апартуністаў, якія ня вераць у боездольнасьць мас і гаворыць: масавая стачка супроць зьніжэньня заработку 8.000 тэкстыльшчыкаў у Вэне канчаткова абвяргнула «тэорыю» апартуністаў. Дэлегат далей адзначае, што гэтыя заводы ўсё больш пераключаюцца на ваенную вытворчасьць.

Прадстаўнік раёну ТРУА гаворыць аб цяжкім становішчы рабочых і сялян гэтага раёну, аб беспрацоўі, нясу пынным зьніжэньні зарплаты і аграрным крызісе. Ён зазначае на ажыўленьне актыўнасьці рабочых, працуючых на ваенных заводах, а іменна: на заводзе Тэрро і Дзіжон, дзе выконваецца заказ на 600 матацыклетак для польскай арміі.

Дэлегат ПАУНОЧНАГА РАЁНУ Францыі падкрэсьлівае рост боездольнасьці рабочых мас. Тав. АРРАШАР (Парыскі раён) адзначае, што хоць арганізацыя Парыскага раёну яшчэ адстае ад руху, аднак, ужо відаць палепшаньне сувязі з масамі. Прамоўца настойвае на неабходнасьці ўзмацненьня кампаніі супроць імпэрыялістычнай вайны.

Дэлегаты сялянскіх раёнаў зазначаюць на неабходнасьць аддачы вялікай увагі аграрным праблемам, а таксама арганізацыі сялянскіх мас і батрацтва. Прадстаўнік ад ЛЯНГЕДОКА (паўдзённая Францыя) спыняецца на гераічнай барацьбе батракоў у КУРСАНЕ, змагаючыся на працягу доўгага часу, наперакор рэфармістам, пад кіраўніцтвам унітарных прафсаюзаў і кампартыі. Партыйная арганізацыя змагла забясьпечыць стачачнікам шырокія сымпатыі сялянскіх мас.

Зьезд пастанаўляе паслаць прывітаньне бастуючым у Курсане сельскагаспадарчым рабочым.

Францыя ў разгары падрыхтоўкі вайны

ПАРЫЖ. 17-III. Пры абгаварэньні ў палаце дэпутатаў бюджэту камуністычны дэпутат Дорыё выступіў з крытычнай клясавага бюджэту Францыі. Францускі ўрад для падрыхтоўкі новай вайны выдаткоўвае ў 15 разоў больш грошай, чымся па міністэрству працы. Пры наяўнасьці больш паўтара мільёна беспрацоўных дапамога, прытым вельмі недастаткова, атрымліваецца толькі 300.000 чал.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня	Замежны фільм САЛАМБО
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз.	ЦУДОЎНАЯ КНІЖКА
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЕДЫЯ (Новы экзэм.)

Слуцкі райспажыўсаюз паведамляе

ўсе зацікаўленыя ўстановы і асоб, якія маюць прэтэнзіі да был. Слуцкага райспажыўтаварыства

аб тым, што яны павінны прад'явіць свае прэтэнзіі ў 2-хтыднёвы тэрмін з дня апублікаваньня

Пасьля гэтага ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Ліквідком Грэскага райспажыўсаюзу

СЭКТАР КАДРАЎ НКФ БССР

АБВЯШЧАЕ **НАБОР КУРСАНТАЎ**

на Гомельскія Цэнтральныя 9-месячныя фінансавыя курсы

па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы фінансавых работнікаў— загадчыкаў райфа, загадчыкаў ашчадкас і інспэктароў.

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам

Заняткі пачынаюцца з 1-га красавіка 1932 году.

За патрэбнымі спраўкамі зьвяртацца ў раённыя і гарадзкія фінансавыя аддзелы

Публікацыя аб згубе аднаго дакумантv каштуе 2 руб.

ПАСТАНОВА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ БССР

16-III 1932 г. **№ 12** гор. Менск

ПРА МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ СПЛАВА ў 1932 г.

У мэтах забясьпечаньня сваячасовага разгортваньня сплава пры адкрыцьці навігацыі 1932 году і ў выкананьне пастановы СНК БССР за 9-III 1932 г., № 25 („Савецкая Бел русь“ за 13-III, № 58) і дырэктывы НК Працы і Наркамлесу СССР за 7-III 1932 г., № 506-124 па гэтаму пытаньню Народны Камісарыят Працы БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У галіне забясьпечаньня рабочай сілай і спэцыялістамі

1. Абавязаць усе сплаўныя арганізацыі, у 5-цідзённы тэрмін, пераглядзець склад вярбовачнага апарату, стварыўшы сталы кадр кваліфікаваных вярбоўшчыкаў і пераключыўшы лепшых вярбоўшчыкаў з лесазагатовак для работы па сплаву на нарыад вясеньняй навігацыі.

Незалежна ад гэтага Лесбелу і кожнай сплаўной канторы вылучыць асоб адказных за набор рабочай сілы і правільнае кіраваньне вярбовачным апаратам.

2. З вылучанымі вярбоўшчыкамі павінна быць напярэдне праведзена канфэрэнцыі, на якіх вярбоўшчыкі павінны быць падрабязна праінструктаваны, устаноўлена адказнасьць за іх работу, пасьля чаго вярбоўшчыкі, з канкрэтнымі заданьнямі аб колькасьці падлягаючай набору рабочай сіле, накіроўваюцца для вярбоўкі у раёны, вызначаныя НК Працы 28-II 1932 г. для ўсіх сплаўных кантор БССР.

3. Абавязаць леспрамгасы, лестрансгасы і іншыя гаспадарчыя арганізацыі аслабаніць на час вясеньняй навігацыі ўсіх спэцыялістаў, працаваўшых у мінулым годзе на сплаве (лоцманаў, іх памочнікаў, кічэмнікаў, матачнікаў і інш.) незалежна ад выконваемай імі ў сучасны момант работы і сьпісы іх падаць раённым, або гарадзкім інспэктарам працы не пазьней 25-III 1932 г.

Інспэктарам працы, разам са сплаўнымі арганізацыямі, у 3-хдзённы тэрмін, пасьля атрыманьня сьпісаў вызначыць тэрмін і месца яўкі на сплаў кожнага спэцыяліста паасобку.

4. Для забясьпечаньня сплаву спэцыялістамі гідратахнікамі, аб'явязаць кіраўнікоў Белмалітрэсту, Белрыбтрэсту і Белбудаб'яднаньня, не пазьней 20-III 32 г., вызначыць і накіраваць у распараджэньне Лесбелу на час правядзеньня сплаву наступную колькасьць гідротэхнікаў:

а) Мэліёрацыйнаму трэсту . . . 4 чал.
б) Белрыбтрэсту . . . . 4 „
в) Белбудаб'яднаньню . . . 1 „

а Лесбелу 21 III 32 г. паведаміць НКПБ аб прыбыцьці паказаных спэцыялістаў і парадку іх скарыстаньня.

5. Даручыць сэктару арганізацыі і аздараўленьня ўмоў працы, не пазьней 20-III 1932 г., выдаць тлумачэньне аб парадку аплаты працы і іншых відаў кампэнсацыі работнікам, паказаным у п. п. 3 і 4 гэтай пастановы.

У галіне арганізацыі працы

6. Выходзячы з таго, што брыгадны мэтод працы павінен зьявіцца асноўнай формай арганізацыі працы на лесасплаве абавязаць Лесбел і ўсе сплаўныя канторы забясьпечыць да пачатку сплаву ахоп брыгадным мэтадам працы з разьвядзеньнем працы на менш 50 проц. усіх рабочых з давядзеньнем процанту ахопу брыгадамі да 1 чэрвеня на менш 80.

7. Прапанаваць Беллеспрому і Лесбелу, у 3-хдзённы тэрмін, распрацаваць і ўзгадніць з сэктарам арганізацыі і аздараўленьня ўмоў працы і інстытутам аздараўленьня і арганізацыі працы тыпы брыгад па паасобных відах сплаўных работ з вучотам усіх асаблівасьцяй басэйнаў і выплавачных пунктаў і не пазьней 21-III г. г. дасланць іх на месца в тым, каб на базе гэтага камплектаваньня па брыгадах і спэцыялістых праводзілася на месцы вярбоўкі.

8. Абавязаць гар. і рай. інспэктароў працы наладзіць сталы нагляд за станам тэхнікі бясьпекі па спэцыяльных работах, дабіўшыся поўнага ажыцьцяўленьня ўсіх выданых НКП СССР правіл па арганізацыі і аздараўленьні ўмоў працы і тэхнікі бясьпекі на гэтых работах (паст. НКП СССР за 1930 г. ад 20-V—надрук. у «Известия НКТ» № 16 і пастан. НКП СССР ад 29-VI—30 г., надрук. у Бюл. СНК БССР за 1930 г., № 16).

9. Даручыць Інстытуту арган. і аздар. умоў працы, пад адказнасьць тав. Дзіхцяра вызначыць сумесна з Лесбелам 1-2 сплаўныя вучасткі, на якіх пастаніць вопытна-паказальнае вывучэньне орган зацыі працы в тым, каб не пазьней 1-га чэрвеня пашырыць гэты вопыт на ўсе вучасткі.

10. Прапанаваць Лесбелу зараз-жа пачаць падрыхтоўку і праверку забясьпечанасьці сплаўшчыкаў жыльлём, грамадзкім харчаваньнем, праверку мерапрыемстваў аб забясьпечаньні сплава продуктамі, прамтаварамі і спэцвопраткай.

11. Прапанаваць Беллеспрому і Лесбелу, сумесна з БРК лесдроўрабочых, на працягу 3-х дзён, падаць на разгляд і зацьверджаньне сэктару арганізацыі аздараўленьня ўмоў працы нормы і расцэнкі па ўсіх сплаўных канторах, басэйнах і выплавачных пунктах, з поўным апіс